Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 16 1932 г. № 183 (4435).

Год выдавьня XVI

Пралетары ўсіх краеў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

ПРА ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНУ і КАНАПЕЛЬ УРАДЖАЮ 1932 г.—Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).

АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПАЛЯПШЭНЬНЯ ГЛЕБЫ І ЗЯБЛІВЫМ ВОРЫВЕ — Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б (1-я стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Кожнаму заводу — сваю харчовую базу. Р. КРАСЬНЕЎСКІ — Што мы бярэм і ад чаго адмаўляемся ў Янкі Купалы (2-я і 3-я стар.).

Правільная расстаноўка сіл, разгортваньне партизасавай работы — вырашаюць посьпех уборкі (2-я стар.).

Тэмпы сіласаваньня не забясьпечваюць стварэньня кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі (2-я стар.).

Надыходзіць адказьнейшы пэрыяд у рабоце транспарту (3-я стар.).

Прамысловая арцель імя Крупскай паўдарнаму змагаецца за шырспашыў (3-я стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3-я стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Гіндэнбург адхіліў патрабаваньне Гітлера (4-я стар.).

Дэтройт — горад голаду і галечы (4-я стар.).

Кожнаму заводу—сваю харчовую базу

ЦК КП(б)Б у пастанове аб выніках сталінскага паходу падкрэсьліў, што «асноўным зьвяном у барацьбе заводзкіх арганізацый за паляпшэньне рабочага снабжэньня павінна быць барацьба за стварэньне ўласнай харчовай базы (прыгараднай гаспадаркі, сьвінарніка, трусатніка, малочнага стада, птушэрніка), якая зьяўляецца аднэй з важнейшых крыніц рабочага снабжэньня.

У гэтай галіне асабліва вялікую ролю адыграць ЗРК, на якіх ускладзена адказная задача па арганізацыі снабжэньня прамысловымі таварамі і харчовымі прадуктамі вядучых фабрык, заводаў і новабудоўляў.

Многія ЗРК БССР на аснове разгортваньня савецкага гандлю, стварэньня ўласнай харчовай базы сталі бясспрэчнымі цэхамі рабочага снабжэньня на фабрыках і заводах. На Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце арганізавана трусагадоўчая гаспадарка на 500 галоў, сьвінарнік на 212 сьвіней, прыгарадная гаспадарка, сад. Кухня-разьмеркавальнік штодзенна адпускае 5.500 абедаў. Пры гарбарні «Бальшавік» ёсьць трусатнік на 150 трусоў, на абутковай фабрыцы — на 70. Нагалоўе сьвіней павялічылася за апошні час на «Чырвонай Барэзіне» з 80 да 160, на заводзе імя Молатава, з 24 да 80, на «Бальшавіку» ад 47 да 121. Буйнейшыя прадпрыемствы арганізавалі і пашыраюць сваю харчовую базу.

Перад кожнай фабрыкай, заводам, новабудоўляй стаіць зусім канкрэтная задача — стварыць па прыкладзе перадавікоў уласную харчовую базу, якая-б забясьпечыла далейшае паляпшэньне снабжэньня рабочых.

Гэта задача можа быць вырашана толькі пры непасрэдным удзеле самых шырокіх мас, усёй пралетарскай грамадзкасьці, на аснове ўсямернай ініцыятывы і самадзейнасьці саміх рабочых.

На жаль, некаторыя ЗРК не зразумелі гэтай задачы, зьяўляюцца самымі адсталымі цэхамі прадпрыемстваў, не паставілі ў цэнтр сваёй увагі барацьбу за сапраўднае разгортваньне самазагатовак у глыбінных пунктах, за пашырэньне агародаў, за дзесяткі і сотні тон смачнага мяса трусоў. Многія ЗРК да гэтага часу ня маюць сваіх трусатнікаў, сьвінарнікаў, агародаў.

Харчовыя канфэрэнцыі, якія паводле пастановы ЦК КП(б)Б праводзяцца па буйнейшых прадпрыемствах, — новая і звычайная дзейсная форма ўдзелу мас у рабоце свайго каапэратыву, у стварэньні ўласнай харчовай базы.

Значэньне харчовых канфэрэнцый перш за ўсё ў тым, што яны ў справе паляпшэньня рабочага снабжэньня мабілізуюць найшырэйшыя масы для выяўленьня скрытых рэсурсаў і крыніц снабжэньня, прымушаюць кожны калектыў паглядзець, што можна зрабіць на месцы, якія рэзэрвы можна выкарыстаць.

Побач з гэтым харчовыя канфэрэнцыі зьяўляюцца буйным мерапрыемствам у перамаганьні ўтрымальніцкіх настрояў з боку паасобных каапэратываў, якія спадзяюцца толькі на тое, што прышлюць па цэнтралізаванаму пляну.

Значэньне іх яшчэ тым большае, што застрэльшчыкамі выступаюць такія буйныя прадпрыемствы, як Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, гарбарня «Бальшавік», швэйная фабрыка імя Дзяржынскага, якія да апошняга часу не праяўлялі выстарчальнай ініцыятывы ў галіне мабілізацыі мясцовых рэсурсаў, у справе разьвіцьця ўласных загатовак.

Першымі ў Саюзе правялі вопыт шырокага прыцягненьня рабочых да вырашэньня задач рабочага снабжэньня грамадзкія арганізацыі маскоўскага заводу «Дынамо». Склікаўшы харчовую канфэрэнцыю, яны ўцягнулі ў яе 700 рабочых. Гэтыя 700 рабочых прымалі актыўны ўдзел у рабоце канфэрэнцыі, у яе сэкцыях і абмеркавалі як павінна працаваць кожная сэкцыя для таго, каб забясьпечыць рабочых заводу прадуктамі са сваіх дапаможных харчовых прадпрыемстваў.

У рабоце першай менскай харчовай канфэрэнцыі, якая ўчора адбылася на гарбарні «Бальшавік», прыняло ўдзел 200 чалавек. Снабжэньне на «Бальшавіку» пастаўлена незадавальняюча. ЗРК марудна перабудоўвае сваю работу, не клапоціцца аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, аб пераважным забесьпячэньні ўдарнікаў. Рабочыя спажыўцы па-бальшавіцку, па-дзелавому крытыкавалі работу свайго каапэратыву і прадявілі яму зусім канкрэтны заказ — загатовіць сёлета ня менш 450 тон гародніны, 375 тон бульбы, 81 тону мяса, 277 тон малака, павялічыць сьвінаадкормачны пункт да 220 галоў, а малочную фэрму да 138 кароў, каб забясьпечыць бесьперабойнае снабжэньне тысячнага калектыву гарбарні.

Але канфэрэнцыя на «Бальшавіку» паказала, што дырэктыва ЦК аб правядзеньні падрыхтоўкі да харчовых канфэрэнцый як масавай кампаніі заводзкімі арганізацыямі ня выкананa. Пытаньне аб канфэрэнцыі ня было папярэдня абгаворана на шырокіх сходах рабочых і гэтым самым работа яе ў пэўнай ступені была змазана. Ня быў вырашан яшчэ рад важных пытаньняў і, у прыватнасьці, пытаньне аб фінансаваньні мерапрыемстваў па стварэньні дапаможных харчовых прадпрыемстваў.

Урок «Бальшавіка» павінен быць улічан усімі прадпрыемствамі якія склікаюць харчовыя канфэрэнцыі. Толькі папярэдняй масавай работай, шырокім абгаварэньнем арыентачных плянаў харчовай базы, правядзеньнем шэфства цэхаў над паасобнымі галінамі работы каапэрацыі будзе забясьпечан посьпех канфэрэнцыі. Трэба выкарыстаць вопыт фабрыкі імя Дзяржынскага, якая разгарнула вялікую масава-падрыхтоўчую работу па правядзеньні канфэрэнцыі, прымацавала да кожнай сэкцыі агрэгаты і істужкі, вылучыла для кіраўніцтва работай сэкцыі адказных работнікаў. У работу сэкцый уцягнут увесь рахункаводны апарат фабрыкі.

У падрыхтоўцы і правядзеньні харчовых канфэрэнцый абавязаны прыняць самы актыўны ўдзел усе партыйныя, гаспадарчыя, прафэсыянальныя і камсамольскія арганізацыі. Гэта дырэктыва ЦК партыі павінна быць поўнасьцю рэалізавана.

Ня трэба забываць, што **стварэньне харчовай базы — адна з цэнтральных задач ня толькі ЗРК, але і ўсіх заводзкіх арганізацый.** Харчовая канфэрэнцыя — толькі першы этап шырокай мабілізацыі мас вакол гэтай важнейшай задачы. Трыкутнікі прадпрыемстваў павінны забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё пастаноў канфэрэнцый, прыцягваючы да гэтай справы рабочых-ударнікаў і каапэрацыйны актыў.

Асноўнае патрабаваньне да заводзкіх арганізацый і спажывецкай каапэрацыі — узначаліць барацьбу за стварэньне ўласнай харчовай базы фабрык, заводаў, новабудоўляў.

Партыйныя арганізацыі павінны штодзенна кіраваць і дапамагаць ЗРК у барацьбе за задаваленьне ўзросшых патрэбнасьцяй рабочых, за поўнае выкарыстаньне паўных рэсурсаў, бо «няма больш гнаровай задачы для бальшавіка-рэвалюцыянэра, які змагаўся дзесяткі год за справу рабочай клясы, як справа дапамогі рабочым, справа паляпшэньня снабжэньня рабочых» (Кагановіч).

Толькі ўцягненьне шырокіх рабочых мас у работу па стварэньні магутнай харчовай базы пры кожным заводзе, максымальнае выкарыстаньне актыўнасьці саміх спажыўцоў, нястомная барацьба з права-апартуністычнымі і «лявацкімі» скажэньнямі прыпушчаў савецкага гандлю — забясьпечыць далейшае паляпшэньне і патаненьне рабочага снабжэньня.

Калгасы Барысаўшчыны перавыканалі жніўеньскі плян збожжазагатовак

БАРЫСАЎ, 15. (Наш кар.).

Збожжазагатоўкі ў раёне праходзяць пры ўзьнятай актыўнасьці калгасных мас. 14 жніўня чырвонымі абозамі здана 51,5 тон збожжа. У перадавых радох па выкананьні збожжазагатовак ідуць калгасы «Бальшавік», Бытчанскага сельсавету, імя Сталіна, «Чырвоная Любатоўшчына», «Чырвонае селішча»—Жыткаўскага сельсавету, «Камсамолец» і «Ударнік», Касьцюковіцкага сельсавету і «Чырвоная зорка», Чырвонаслабодзкага сельсавету.

ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ ПЛЯНАВАЕ ЗАДАНЬНЕ ЗА ЖНІВЕНЬ МЕСЯЦ СА ЗНАЧНЫМ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ. ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК У РАЁНЕ ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ НА 15 ЖНІЎНЯ ВЫКАНАН НА 135,5 ПРОЦ.

КАЛГАСЫ ІМЯ 13-ЦІГОДЗЬДЗЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, «БАРЭЦ», «ЧЫРВОНЫЯ ПЕЧЫ» І «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА», ПАПЯРНЯНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ.

ІВАШЫН.

Ідуць чырвоныя абозы

У дзень 15-годовага юбілею шлем палкае бальшавіцкае прывітаньне рэдакцыі газэты «Зьвязда». Раўняючыся па ЦО КП(б)Б якая аддала змагалася і змагаецца за генэральную лінію лепінскай партыі, наша газэта — орган Крупскага РК КП(б)Б «Камуністычны шлях» — пад кіраўніцтвам партарганізацыі дабілася значных посьпехаў. У дзень юбілею арганізаваны нашчырвоныя абозы са збожжам і на працягу 10 жніўня калгасамі Халопеніцкага і Крупскага сельсаветаў здана ў падарунак «Зьвязьдзе» 2.476 цэнт. збожжа. Работа ня спынілася. Ідуць масавыя чырвоныя абозы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў са збожжам і сенам з Скаборскага і інш. с.-с.

Запэўняем ЦК КП(б)Б і рэдакцыю «Зьвязды», што рэдакцыя «Камшляха», як калектыўны рабськор «Зьвязды» разам з усёй масай рабськораў і нізавога друку Крупшчыны і надалей будзе змагацца за палітычна-гаспадарчыя задачы ў раёне, за ўздым на вышэйшую ступень рабськораўскага руху і нізавога друку.

Рэдактар газэты «Камшлях» — МАРОЗ.

Пра загатоўкі ільну і канапель ураджаю 1932 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

СНК БССР і ЦК КП(б)Б адзначаюць зусім нездавальняючае выкананьне пляну пра веденых загатовак ільну і ільнанасеньня ў загатоўчую кампанію 1931-32 г. і поўны зрыў загатовак пянькі і канапель: выкананьне гадавога пляну загатовак складае па ільне—67,1 проц., па ільнанасеньні — 82,5 проц., па пяньцы—20,8 проц. і па канопляхах—29 проц.

Такое становішча стала магчымым у выніку нездавальняючага кіраўніцтва ільнапеньказагатоўкамі з боку загатоўчых арганізацый і раду райкомаў і райвыканкомаў, якія замест разгортваньня бальшавіцкай барацьбы за выкананьне плянаў і барацьбы з разважаньнямі аб нераальнасьці плянаў загатовак, прадаставілі загатоўкі самацёку і заняліся імі з вялікім спазьненьнем.

СНК і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Устанавіць плян загатовак ільну і канапель з ураджаю 1932 г. па БССР з разьмеркаваньнем па сэктарох у наступнай колькасьці:

Ільну (у пераводзе на валакно)	27.000 тон.
у тым ліку саўгасам	450 »
калгасам 17.000, аднаасобнікам	9.550 »
пянькі (у пераводзе на валакно)	1.600 »
у тым ліку саўгасам	300 »
калгасам	800 »
аднаасобнікам	500 »
ільнянога семя	21.000 »
у тым ліку саўгасам	100 »
калгасам	12.000
аднаасобнікам	8.500 »
канапляннага насеньня	980 »
у тым ліку саўгасам	50 »
калгасам	460 »
аднаасобнікам	470 »

2. Для зьнішчэньня памылак мінулага году абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты ў дэкадны тэрмін з моманту атрыманьня раённага пляну загатовак ударным чынам прапрацаваць разам са старшынямі сельскіх саветаў і старшынямі калгасаў разьмеркаваньне раённага пляну па сельскіх саветах і калгасах з поўным улікам асаблівасьцяй паасобных калгасаў і вёсак, не дапускаючы ўраўніловкі і мэханічнага падыходу пры вызначэньні пляну здачы асобным калгасам і вёскам.

3. Устанавіць тэрміны для давядзеньня гадавога пляну загатовак ільну і пянькі да раёнаў не пазьней 15 жніўня г. г., да калгасаў і вёсак (да аднаасобнікаў) — да 25 жніўня.

4. Абавязаць упаўнаважанага Камітэту загатовак СПА па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Зямляробства распрацаваць пляны загатовак у раённым разрэзе, згодна з вытворчымі праграмамі заводаў па першаапрацоўцы па відах здачы (салома, траста, трапанае валакно) і спусьціць раёнам разам са спускам агульнага пляну загатовак ільну і пянькі.

5. Устанавіць крайнія тэрміны выкананьня пляну загатовак:

па ільне	1 сакавіка 1933 г.
па пяньцы	1 лістапада 1933 г.
па ільняным і канапляным семі	1 студзеня 1933 г.

6. Устанавіць наступнае каляндарнае разьмеркаваньне пляну загатовак у процантах:

	Лён	Пянька	Канаплянае насеньне	Ільнянае семя
III квартал 1932 г.	5	—	—	25
IV квартал 1932 г.	75	40	100	75
I квартал 1933 г.	20	40	—	—
II квартал 1933 г.	—	20	—	—

7. Усклясьці пэрсанальную адказнасьць за выкананьне пляну загатовак ільну і пянькі па БССР на т. Красоўскага (нам. упаўкамгас СПА) і тав. Шэйніна (Загатлён), абавязаўшы іх падрыхтаваць да пачатку рэалізацыі загатовак тэхнічную базу для бесьперабойнай прыёмкі ільну і канапель ад здатчыкаў.

У раёнах адказнасьць за выкананьне пляну загатовак ускладаецца на старшынь раённых выканаўчых камітэтаў і упаўнаважаных Загатлёну.

8. Абавязаць Белільнатрэст, пад адказнасьць т. Кірэева, пераапрацаваць на заводах трасты і саломы 14.000 тон (у пераводзе на трапанае валакно) у наступны тэрміны:

У IV квартале 1932 г.	3.500 тон
« I квартале 1933 г.	4.200 тон
« II квартале 1933 г.	4.800 тон.
« III квартале 1933 г.	1.500 тон.

9. Абавязаць Белпенькатрэст, пад адказнасьць т. Кірэева, пераапрацаваць на заводах пенька-саломы і трасты (у пераводзе на валакно) 1.100 тон у наступныя тэрміны:

У IV-м квартале 1932 г.	170 тон.
У I » 1933 г.	300 »
У II » 1933 г.	500 »
У III » 1933 г.	130 »

10. Абавязаць т. т. Купрыянава і Кірэева ўжыць тэрміновае захады да сваячасовага абсталяваньня ўсіх заводаў, забясьпячэньня іх аднаведнай рабочай сілай і спэцыялістамі і да абавязковай поўнай пераапрацоўкі ўсёй колькасьці трасты і саломы, паказанай у пунктах 8-9 гэтай пастановы з тым, каб пераапрацоўка ішла бесьперабойна і была праведзена ў тэрміны, зацьверджаныя прамфінпляннамі кожнага заводу ў паасобку.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, у раёнах якіх знаходзяцца ільнапеньказаводы, узяць пад асаблівы нагляд работу заводаў і дапамагчы ім у наборы рабочай сілы і ў сканчэньні пераапрацоўкі сырцу ў вызначаны тэрмін.

11. Для павышэньня зацікаўленасьці калгасьнікаў у апрацоўцы ільну і канапель правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) дазволіць калгасам скарыстаць да 10 проц. ад колькасьці фактычна атрыманага ільну—пры абавязковым выкананьні калгасам у тэрмін устаноўленага пляну загатовак. Разьмеркаваньне ўказаных 10 проц. ільну паміж калгасьнікамі (у аднаасобнае іх распараджэньне) рабіць у адпаведнасьці з колькасьцю прападзён, якія кожны калгасьнік мае па пасеве, уборцы і апрацоўцы ільну.

Астатняя частка прадукцыі ў калгасе—пасьля выкананьня дзяржаўнага пляну здачы ільна-пянькі і выдачы 10 проц. калгасьнікам, якія працавалі па пасеве, уборцы і апрацоўцы ільну, скарыстоўваецца для задаваленьня вытворчых патрэб калгасу, а таксама для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі па працадзнях;

б) пасьля выкананьня пляну збожжазагатовак, ільна і канапляводчыя калгасы робяць разьмеркаваньне паміж калгасьнікамі 70-80 проц. ад агульнага фонду хлеба, належачага да разьмеркаваньня. Астатнія 20-30 проц фонду павінны быць разьмеркаваны паміж калгасьнікамі пасьля сканчэньня масавай апрацоўкі ільну і канапель з улікам колькасьці працадзён, затрачаных кожным калгасьнікам на пасеў, уборку і апрацоўку гэтых культур;

в) хлеб, які атрымліваецца калгасамі ад дзяржавы супроць здачы ільну і пянькі, разьмяркоўваць толькі паміж калгасьнікамі, якія працавалі на пасеве, уборцы і апрацоўцы ільну і канапель;

г) забясьпечыць да канчатковага разьмеркаваньня грашовых даходаў паміж калгасьнікамі абавязковую выдачу авансам кожнаму калгасьніку, запятаму на апрацоўцы ільну, ня менш 50 кап. на працадзень, робячы разьлік ня менш як праз кожныя 5 дзён;

д) у раёнах, якія пасьпяхова выконваюць плян загатовак ільну, адкрыць дзяржаўныя і калгасныя алейні для пераапрацоўкі на алей давальнага сырцу.

12. Устанавіць плян выдачы хлеба для здатчыкаў ільну і пянькі на 1932-1933 г. у разьмеры 26.000 тон.

Абавязаць Народны Камісарыят Снабжэньня паводле пастановы Эканамічнага савету БССР за 9 сакавіка 1932 г. забясьпечыць выдачу макухі і алею супроць здаваемага насеньня ільну і канапель.

Асоб, якія парушаюць пастанову Эканамічнага савету БССР за 9 сакавіка 1932 г., прыцягваць да судовай адказнасьці.

Выдачу хлеба рабіць толькі праз склады Беларускай канторы Загатлёну ў пунктах здачы ільну і пянькі, а выдачу макухі і алею рабіць у пунктах здачы семя (склады Белзагатлёну, алейні).

13. Абавязаць упаўнаважанага Камітэту таварных фондаў пры СПА і Белканторы Заготлёну дабіцца атрыманьня з фондаў, якія адпушчаюцца на загатоўку ільну і пянькі, а таксама ільнянога і канаплянага семя, плянуемых прамтавараў у 3-4 кварталах (хусткі, абутак, нітки, мыла, мануфактура, махорка) з тым, каб забясьпечыць іх рэальнае атрыманьне раёнамі ў III квартале — 37 проц. і у IV квартале—63 проц., пакіроўваючы ў парадку мэтавага прызначэньня ў ільнапеньказагатоўчыя раёны.

Забараніць спажывецкай каапэрацыі расходаваць гэтыя фонды прамтавараў не па прызначэньні. Вінаватых у расходаваньні гэтых фондаў не па прызначэньні прыцягваць да суровай адказнасьці.

Абавязаць Белзагатлён і Белкаапсаюз, пад адказнасьць т. т. Шэйніна і Хаскіна, устанавіць кантроль і ўлік як за асартымэнтам адгружаемых тавараў, таксама і за скарыстаньнем іх на мясцох.

14. Для захаваньня лепшай апрацоўкі і павышэньня якасьці ільну, якая за апошнія гады па БССР значна знізілася, прызнаць неабходным:

а) прамтавары выдаваць выключна ў залежнасьці ад якасьці здаваемага ільну і пянькі;

б) абавязаць т. т. Красоўскага і Шэйніна разам з Народным Камісарыятам Зямляробства распрацаваць шкалу, вызначаючы залежнасьць разьмеру выдачы хлеба здатчыку ад якасьці здаваемай ім прадукцыі.

15. Забараніць сыстэму аплаты чэкамі і іншымі грашовымі суррагатамі за здаваемую прадукцыю, не дапускаючы ніякай запазычанасьці. Прапанаваць НК РСІ і Народнаму Камісарыяту Юстыцыі прыцягваць вінаватых у парушэньні гэтага пункту да суровай адказнасьці.

Абавязаць Белкантору Дзяржбанку, пад адказнасьць тав. Фэльдмана, забясьпечыць ільнапеньказагатоўкі выстарчальнымі крэдытамі і наяўнымі грашыма для бесьперабойнай расплаты са здатчыкамі.

16. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, Белкалгасцэнтр, Белтрактарацэнтр забясьпечыць сваячасовую ўборку ільну і пянькі і арганізацыю першачарговай пераапрацоўкі іх, устанавіўшы ў 5-дзенны тэрмін каляндарныя пляны ўсіх працэсаў пераапрацоўкі (цераблёньне, абмалот, расьціл і інш., а таксама прывесьці ў поўную гатоўнасьць уборачны, малацільны і мяльна-трапальны інвэнтар як у калгасах, таксама і ў аднаасобных гаспадарках.

Прапанаваць Белсельдзяржснабу неадкладна рэалізаваць усе ільнаапрацоўчыя машыны, якія ёсьць на складах, ужыўшы адпаведныя захады да хутчэйшага прасоўваньня іх да вытворцаў.

17. Абавязаць Ільнакапляводбуд безагаварочна скончыць пабудову ільнапеньказаводаў у вызначаны СНК БССР тэрмін.

18. Абавязаць упаўнаважанага Камітэту загатовак СПА і Белкантору Загатлёну забясьпечыць складаньне стандартных узораў ільну, пянькі, трасты і саломы, з першых паступіўшых партый, прычым у больш буйных калгасах практыкаваць устанаўленьне стандартных узораў у саміх калгасах.

19. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, Белкалгасцэнтр і Белтрактарацэнтр распрацаваць практычныя паказальнікі зьлезьнай расцёнкі пераапрацоўкі ільну і пянькі з улікам лепшай аплаты за лепшую якасьць і колькасьць атрыманай прадукцыі.

20. Улічваючы недаўкамплектаваньне апарату Загатлёну адпаведнымі работнікамі і спэцыялістамі, асабліва на раёнах, прапанаваць раённым камітэтам партыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на падбор і камплектаваньне раённых упаўнаважаных Загатлёну і на прыём складанага апарату, вярнуўшы ў апарат Загатлёну ўсіх работнікаў, якія раней працавалі на ільназагатоўках у сыстэме Белкаапсаюзу, Белільнасаюзу, па базах, складах БТА і Экспартлёну, якія пасьля 1 асакавіка пераведзены на работу, ня зьвязаную з ільном, і не дапушчаць перакідкі ільназагатоўчых работнікаў на іншую работу.

21. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам арганізаваць пастаянае кіраваньне сельскімі саветамі і камісіямі садзейнасьці загатоўкам, асабліва ільну і пянькі, і забясьпечыць выразную лінію ў дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам.

22. У жывёлагадоўчых раёнах, у якіх Загатлён ня будзе мець сваёй сельскай загатоўчай сеткі, прыцягнуць да ільнапеньказагатовак раённыя саюзы спажывецкай каапэрацыі і сельскія спажывецкія таварыствы.

Прапанаваць т. т. Хаскіну і Шэйніну абавязаць свае раённыя зьвяньні заключыць адпаведныя дагавары на працягу 10 дзён.

23. Прапанаваць НК Зямляробства, Белкалгасцэнтру, упаўнаважанаму Трактарацэнтру і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць пасеў у 1933 г. лепшымі гатункамі насеньня, дабіваючыся сваячасовай сэмкі іх у калгасам і саўгасам (без перашкоды для выкананьня пляну загатовак насеньня па алей) і праводзіць абмен радавога насеньня па гатунковае.

СНК і ЦК абавязваюць партыйныя і савецкія арганізацыі разгарнуць масавую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, арганізаваць правільнае і шырокае скарыстаньне жаночае працы, мабілізаваць увагу ўсіх калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў на барацьбу са стратамі, на высокую якасьць уборкі і апрацоўкі ільну і канапель.

СНК і ЦК КП(б)Б падкрэсьліваюць, што пасьпяховае выкананьне пляну загатовак ільну і канапель цалкам залежыць ад таго, наколькі партыйныя, савецкія і гаспадарчыя арганізацыі змогуць па-бальшавіцку паставіць справу ўборкі і першачарговай пераапрацоўкі ільну і пянькі. Сваячасовае і поўнае выкананьне ільнапеньказагатовак мае вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне як для ўмацаваньня сырцовай базы лёгкай прамысловасьці, якая абслугоўвае патрэбы шырокіх мас, так і для пашырэньня экспарту ў 1933 годзе.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР—М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б—ШАРАНГОВІЧ.

10 жніўня 1932 г.

Аб мерапрыемствах па лушчэньні глебы і зяблівым ворыве

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

СНК БССР і ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Улічваючы ўсе наяўныя магчымасьці, прыняць прапанову Наркамзему БССР, зацьвердзіўшы да выкананьня плян падняцьця зябі і цаліны ў разьмеры 1.500 тыс. га — з наступным разьмеркаваньнем па сэктарох: саўгасы — 150 тыс. га, калгасы — 825 тыс. га (з іх калгасы, якія абслугоўваюцца МТС — 335 тыс. га), аднаасобны сэктар — 525 тыс. га.

Плян падняцьця цаліны ўстанавіць у разьмеры 140 тыс. га, з іхна саўгасам—10 тыс. га, па калгасам — 90 тыс. га, у тым ліку МТС — 50 тыс. га і аднаасобным сэктары — 40 тыс. га. Апрача гэтага, абавязаць райкомы і РВК, саўгасы і МТС забясьпечыць узьняцьце цаліны, недавыкананае вясной 1932 г.

Абавязаць райкомы і райвыканкомы давесьці плян па падняцьці цаліны і зяблівага ворыва да саўгасаў, калгасаў і населішч — да 25 жніўня.

2. Абавязаць Наркамзем, саўгастрэсты, Беладдзяленьне Трактарацэнтру, Калгасцэнтр, райкомы і райвыканкомы на аснове правільнай арганізацыі працы, поўнага скарыстаньня трактараў і коняй, масавай палітычнай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, — скончыць зяблівае ворыва па ўсёй БССР да 20 кастрычніка.

3. Абавязаць пэрсанальна сакратароў райкомаў і старшынь РВК мерапрыемствы па лушчэньні глебы і зяблівым ворыве паставіць як адну з важнейшых гаспадарча-палітычных задач у сельскай гаспадарцы, устанавіць самы строгі кантроль за гэтай справай, забясьпечыць канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва кампаніяй.

4. Абавязаць дырэктароў саўгастрэстаў, Беладдзяленьне Трактарацэнтру, Калгасцэнтр адначасова з уборкай яравых ужыць захады да поўнага правядзеньня лушчэньня глебы, з пераключэньнем на зяблева ўсяго трактарнага парку і значнай часткі конскай цягавай сілы і поўнага скарыстаньня шматлямешнікаў і дыскавых барон да лушчэньня.

5. Папярэдзіць усе райкомы, райвыканкомы дырэктароў саўгастрэстаў, Беладдзяленьне Трактарацэнтру, Калгасцэнтр, што посьпех барацьбы з пустазельлем, шкоднікамі і хваробамі с.-г. расьлін, барацьбы за ўздым ураджайнасьці і сваячасовай падрыхтоўкі глебы да веснавой пасеўнай кампаніі, залежыць ад сваячасовага і поўнага выкананьня мерапрыемстваў па лушчэньні глебы і падняцьці зябі.

6. Прапанаваць Наркамзему, райкомам і райвыканкомам паставіць задачай прадыскаваньня таго зяблівага ворыва, на якім будзе сеяцца лён самай раньняй вясной, а таксама правесьці зяблева ў гаспадарках таварна-прамысловага гародніцтва, забараніўшы пасеў гародніны ў гародных саўгасах і калгасах вясной 1933 году не па зяблівым ворыве.

7. Абавязаць усе партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць у часе зяблівага ворыва сацыялістычную ўзаемадапамогу паміж саўгасамі і калгасамі.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б папярэджваюць, што ацэнкаю здольнасьці партыйных савецкіх арганізацый змагацца за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, па бач з уборачнай кампаніяй і асеннянай сяўбой, будзе зьяўляцца тое, наколькі яны справяцца з выкананьнем пляну зяблівага ворыва.

8. Даручыць камісіі выкананьня ўзяць пад асобны нагляд выкананьне мерапрыемстваў па лушчэньні, зяблівым ворыве і ўзьняцьці цаліны.

Намесьнік старшыні СНК БССР—Г. ГРЫСЕВІЧ.

Сакратар ЦК КП(б)Б—В. ШАРАНГОВІЧ.

Партыйнае будаўніцтва

Правільная расстаноўка сіл, разгортванне партмасавай работы—вырашаюць посьпех уборкі

Прыклад умелай пастаноўкі работы

Партарганізацыя сьвінагадоўчага саўгасу «Халопеничы», Брускага раёну, падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі распачала адначасова з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Скончыўшы ў скарочаныя тэрміны сяўбу, ячэйка так арганізавала рамонт уборачных машын, што яшчэ ў чэрвені яны былі ў поўнай гатоўнасьці. Бюро ячэйкі быў вылучан партыец тав. Школьнікаў, які непасрэдна сам працаваў па рамонце машын. Праведзеная ім партыйна-масавая работа адыграла немалаважную ролю ў справе арганізацыі рабочых па сваячасовае скончэньне рамонту.

У свой час большасьць партыйцаў ячэйкі працавала на розных пасадах, а не непасрэдна на вытворчасьці.

Перад уборачнай кампаніяй праведзена перастаноўка партыйных сіл. Большасьць партыйцаў пасланa непасрэдна на вытворчасьць.

З 17 членаў і кандыдатаў толькі 4 працуюць на віруючых пасадах (дырэктар, сакратар ячэйкі, старшыня рабкому і нам. дырэктара па арганізацыі і забесьпячэньні грамадзкага харчаваньня), астатнія працуюць непасрэдна на вытворчасьці, тры — трактарыстамі, два — кавалямі, чатыры — у сьвінагадоўчым цэху, астатнія на палявых работах. Цяпер непасрэдна па ўборцы на полі працуюць 13 партыйцаў.

Кожнаму камуністу дана заданьне па правядзеньні партыйна-масавай работы, за якую ён і адказвае. Так, напрыклад, тав. Кабановіч прымацаван да мэханічнага цэлага цэху, тав. Сарокін да сьвінагадоўчага цэху і буйгаўніцтва, тав. Шуб — да паляводства і г. д. Гэтым таварышы адказваюць перад ячэйкай за разгортваньне партыйна-масавай работы ў паказаных цэхах.

Акрача гэтага, у кожнай брыгадзе ёсьць партыйцы, якім даюцца канкрэтныя заданьні па правядзеньні партыйна-масавай работы. Напрыклад, у брыгадзе па ўборцы сена жанчын гэтыя абавязкі выконваў тав. Жаўкевіч, які працаваў касцом, правоўку гутаркі ў брыгадзе па растлумачэньні пастаноў партыі і адначасова зьяўляўся ініцыятарам сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Такая пастаноўка работы забясьпечыла перавыкананьне норм па касьбе. Так, напрыклад, брыгада тав. Аляксеенкі, якая касіла ўручную, сыстэматычна перавыконвала норму на 25 проц. Тав. Казаленка — трактарыст па касьбе — сыстэматычна перавыконваў норму: замест 4 га скошваў ад 4,5 да 5 га. Канкрэтнае партыйнае кіраўніцтва кожным вучасткам, кожнай брыгадай па ўборцы сенажаці дало магчымасьць скончыць уборку да 20 ліпеня (убрана 250 га).

Яшчэ лепш была арганізавана і забясьпечана партыйным кіраўніцтвам уборка жыта і яравых. Па ініцыятыве камуністаў, машынная брыгада спаборнічала з брыгадай жнівярак, брыгада жнівярак з брыгадай зязьлічыкаў і г. д. На полі, як правіла, праводзіліся ў часе абедзенага перапынку гутаркі. Напрыклад, былі праведзены гутаркі аб калгасным гандлі, аб выніках лепшэньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, аб дні 1 жніўня і г. д. Тут жа была арганізавана чытка газэт. У выніку брыгада жнівярак перавыконвала норму на 20 проц.; брыгада тав. Галасоўскага па ручным жніве сыстэматычна перавыконвала норму на 20 проц. Рабочы калектыў на чале з ячэйкай жыў адзінай думкай: найлепш і найхутчэй, бяз страт скончыць уборачную кампанію. Вось факт — сьведка высокай пралетарскай сьвядомасьці. Калі рабочаму Галасоўскаму заману за ўдарную работу далі пуцёўку на месяц у дом адпачынку, ён зьвярнуў гэту пуцёўку сказаўшы: «Цяпер ня час адпачываць. Калі скончым уборку, тады будзем думаць і аб адпачынку».

Саўгас да 1 жніўня скончыў уборку жыта і ячменю і прыступіў да малацьбы. Ужо намалочана 2.500 пудоў жыта. З 24 ліпеня, з часу пастановы агульнага сходу рабочых, уборка праходзіць бяз выходных дзён.

Ня дрэнна была арганізавана і барацьба са стратамі ўраджаю. Там, дзе былі агрэхі пры жніве, каласы вырваліся, на поле пушчаны конныя грабелі.

Пасьпяховаму правядзеньню ўборачнай кампаніі ня мала спрыяла добрая арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў саўгасе. Па гэтай галіне працуе спецыяльна вылучаны таварыш, які ўмела разгарнуў самазагатоўкі. Абеды заўсёды масныя і добрай якасьці. Няма нічога дзіўнага, што саўгас ня ведае цякучасьці рабочай сілы.

У сувязі з юбілеем «Зьвязды» рабочыя саўгасу прынялі рад канкрэтных самазабявязацельстваў. Пасьпяхова праводзіцца падрыхтоўка да асеньняй сяўбы. Ужо поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы 90 га глебы. Гной увесь зьвезен на поле, расьсеяна два вагоны мінэральных угнаеньняў.

Партячэйкі калгасаў і саўгасаў павінны вучыцца ў халопеніцкіх камуністаў, як трэба працаваць, і па іх прыкладу арганізаваць скончыць уборачную і падрыхтавацца да правядзеньня асеньня-пасеўнай кампаніі.

М. Сакалоўскі.

Большасьць ячэек Лёзьняншчыны не разгарнулі партыйна-масавай работы на полі

Уборка жыта ў Лёзьнянскім раёне ў поўным разгары. Пасьпелі раньнія ячмені. Пасьпеў лён. Ня скончана яшчэ сенажаць. Дазёка ня ўсюды падрыхтаваны папар.

У гэты час, як ніколі, узрастае роля партыйных ячэек, як арганізатараў барацьбы калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас адмасабілкаў за насьпяховае правядзеньне ўсіх кампаній.

Як-жа партыйныя ячэйкі Лёзьнянскага раёну перабудавалі сваю работу па-новаму, як яны спраўляюцца з такімі важнымі задачамі дня?

Спынімся на асобных прыкладах. Кабыльніцкі сельсавет, які амаль поўнасьцю калектывізаваны, першым у раёне пачаў і скончыў уборку сенажаці. Канчаецца жніво і ўборка з поля жыта і раньняга ячменю. Распачата цэрабленьне ільну. Не адстае і падрыхтоўка папару.

Што забясьпечыла гэтыя перамогі Кабыльніцкага сельсавету? Ён знаходзіцца ў аднолькавых умовах з усімі сельсаветамі раёну.

Посьпехі на ўборцы калгасаў Кабыльніцкага сельсавету тлумачацца тым, што мясцовая партыйная ячэйка правільна расставіла свае і камсамольскія сілы ў гасподарках, па калгасных брыгадах, наладзіла сыстэматычную масавую работу з маладымі партыйцамі і кандыдатамі партыі.

Члены ячэйкі, расстаўленыя па калгасах і калгасных брыгадах, як перадавікі, паказваюць прыклад за касой, за плугам за машынай, перавыконваючы нормы, вымагаючыся са стратамі. Камуністы-брыгадзіры паказваюць узоры працы.

Бюро ячэйкі сыстэматычна правярае работу членаў і кандыдатаў партыі. Рэгулярна бываюць партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца канкрэтныя гаспадарчыя пытаньні. Члены ячэйкі, як правіла, прыходзяць на сходы падрыхтаванымі, з лічбамі, з практычнымі вынікамі работы. Кожны партыец дакладна ведае заданьне сваёй брыгады, групы і адказвае за выкананьне гэтага заданьня.

Ячэйкі і кожны член партыі вядуць пастаянную партыйна-масавую работу з калгаснікамі—на сходах, на полі ў часе перапынку, дома ў вольную гадзіну ад працы.

Адпачасова парт'ячэйка вядзе рэгулярную работу з ударнікамі: яна практыкуе ня толькі скліканьне нарад ударнікаў, але і гультабёў, перавыхоўваючы іх.

Кабыльніцкі сельсавет ідзе наперадзе. Арганізатар яго перамог—парт'ячэйка, сакратаром якой выбраны тав. **Калатоўкін.**

Ня многія парт'ячэйкі Лёзьнянскага раёну могуць пахваліцца такімі вынікамі перабудовы сваёй работы

У большасьці сельсаветаў партыйцы працуюць дзе хочаце, толькі ня ў калгасе, не на полі, у брыгадзе.

Вось у калгасе «Іскра», Чарнецкага сельсавету лічацца тры партыйцы членамі калгасу. Адзін з іх, тав. **Шухман**—загадчык гаспадаркі санаторыі, другі **Зуеў** Пётра—студэнт; трэці—**Варапаеў** Нестэр — крамнік сельспажыўтаварыства.

Ёсьць у калгасе адзін камсамолец і той... пасьпуны член калгасу, бо працаваў крамнікам, а зараз невядома дзе будзе працаваць. Пакуль што... «беспрацоўны».

Ні аднаго ні партыйца, ні камсамольца на полі, на скотным двары няма.

Гэта ячэйка партыйна-масавую работу праводзіць такім чынам: прыдуць калі-некалі на сход «прымацаваныя» таварышы пагаварыць аб чым-небудзь з налёту, ня цікавячыся «дробязямі» калгаснага жыцьця і працы, і пойдуць. Лічыцца, што партыйны абавязак выкананы.

І так не ў адным калгасе «Іскра», так у большасьці калгасаў раёну

Партыйцаў, як правіла, усіх, у тым ліку толькі што прынятых кандыдатаў, прымацоўваць да калгасаў. А далей? Пасьля таго, як малады, яшчэ ня выхаваны кандыдат, прымацоўваецца да пэўнага вучастку работ (калгас, вёска), ячэйка аб ім забывае, не дапамагае, па месяцох і году не правярае яго работы.

Няма ў большасьці партыйных ячэек партыйна-выхаваўчай работы ня толькі сярод калгасных мас і працоўных сялян, але і сярод партыйцаў, асабліва кандыдатаў.

Партсходы, як правіла, бываюць надзвычай рэдка, пытаньні не падрыхтоўваюцца.

Усе гэтыя моманты адзначаны ў пастанове агульнараённага партыйнага сходу, які абавязуўся дабіцца карэннага пералому ў пастаноўцы партыйна-масавай работы на вёсцы, у правядзеньні чарговых с.-г. кампаній.

Трэба, каб кожная ячэйка па прыкладу кабыльніцкай, зараз-жа шырока разгарнула партыйна-масавую работу. Ад гэтага будзе залежыць посьпех бягучых базавых кампаній.

А. Мікуцкі.

Партгруп... няма

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). 2 ліпеня ў Віцебску адбылася куставая міжраённая нарада сакратароў парт'ячэек, сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў і МТС. На нараду прыбылі прадстаўнікі 14 раёнаў (Полацку, Дуброўны, Сяньно, Суражу, Лёзны, Віцебску, Бешанковіч, Дрысы, Чашнікаў, Асьвеі, Ворны, Вушачаў, Сіроціна і Лепеля).

Асноўнае пытаньне работы нарады — перабудова аргмасавай партыйнай работы, узмацненьне парткіраўніцтва ў нізавых (саўгасных і калгасных) зьвеньнях, асабліва ў часе ўборачнай і загатоўчай кампаній.

Інфармацыі з месц вельмі выразна паказваюць, што ў большасьці прадстаўленых раёнаў партработа перабудавана фармальна. Нізавыя партыйныя зьвеньні штодзённым партыйным кіраўніцтвам, як належыць, не забясьпечаны. Сілы расстаўлены няправільна, а гэта моцна адбіваецца на ходзе ўборачнай кампаніі. Прывядзем некаторыя факты.

Пры камуне «Чырвоны артылерыст», Полацкага раёну, ёсьць ячэйка, якая налічвае 8 членаў партыі і 10 кандыдатаў і камсамольская ячэйка з 26 асоб. У 3-й паляводчай і гаспадарчай брыгадах арганізаваны дзьве партгрупы, але **группарторгі ня выбраны,** іх абавязак выконвае непасрэдна сакратар парт'ячэйкі. На паасобных вучастках партарганізатары таксама **ня вылучаны.** У 5-й паляводчай брыгадзе гэтай камуны нават няма ніводнага камуніста.

Яшчэ горш у калгасе «Авангард», Лепельскага раёну. Замест таго, каб арганізаваць партгрупы ў брыгадзе, яна арганізавана пры праўленьні калгасу і группарторгам выбрана адміністрацыйная асоба. Ячэйка налічвае 19 чал., але вытворчыя вучасткі камуністамі і камсамольцамі не забясьпечаны.

Таксама і ў саўгасе «Пачэявічы», Чашніцкага раёну. З 29 чалавек членаў ячэйкі «не знайшлося» партарганізатара непасрэдна з вытворчасьці. Усе партарганізатары на фармах зьяўляюцца загадчыкамі фэрм. Камсамольская ячэйка ў гэтым саўгасе (налічвае 10 чал.) ня мае ніводнага КСМ-арганізатара на вучастках. Нявыхады камуністаў і камсамольцаў на работу ўвайшлі ў сыстэму. Пытаньнем культбытавога абслугоўваньня рабочых парт'ячэйка не займалася.

У Сіроцінскай МТС парт'ячэйка налічвае 25 членаў і кандыдатаў партыі, але замест таго, каб пры кожным вытворчым вучастку (якіх ёсьць чатыры) стварыць партгрупу або вылучыць партарганізатара, членаў і кандыдатаў партыі фармальна прымацавалі да калгасаў. Што робіць гэтыя прымацаваныя ніхто не правярае.

Не перабудавана работа і ў Сененскім раёне. Так, у самым буйным саўгасе — «Беліца-Відакі» ў брыгадах і вучастках партыйных груп і партарганізатараў няма, а ў Лёзьнянскім раёне ў калгасе «Інтэрнацыянал» лічаць, што яны канчаткова перабудавалі партработу толькі таму, што перанесьлі ячэйкі з сельсавету ў калгас.

Што датычыць перанясеньня партмасавай работы ў нізавыя саўгасныя і калгасныя зьвеньні, дык у гэтай галіне справа стаіць яшчэ горш. Дырэктывы партыі і ўраду аб уборачнай, загатоўчай кампаніях, размеркаваньні ўраджаю і г. д., у большасьці распрацоўваліся на сходах усіх членаў калгасу (і то ня ўсюды), а ня ў брыгадах і паасобных вытворчых вучастках. Партыйная вучоба ў большасьці раёнаў сарвана і мер да яе неадкладнага наладжаньня ня прымаецца.

Бясспрэчна, усё гэта вельмі адмоўна адбіваецца на ходзе ўборачнай кампаніі. У большасьці раёнаў, прадстаўнікі якіх былі на нарадзе, уборка праходзіць марудным тэмпамі.

Абгаварыўшы дэтальна становішча партмасавай работы, кіраўніцтва нізавымі зьвеньнямі, нарада вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове партыйнай работы.

У адзнаку 15-гадовага юбілею «Зьвязды» нарада прыняла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў, выкананьне якіх павінна забясьпечыць пасьпяховае скончэньне ўборкі і сапраўдную перабудову арганізацыйнай і партмасавай работы.

Арк. Зарубежны.

ТЭМПЫ СІЛАСАВАНЬНЯ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ СТВАРЭНЬНЯ КАРМОВАЙ БАЗЫ ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ

Зводка НКЗБ

аб ходзе сіласаваньня па БССР на 10 жніўня 1932 году

№№ па ч.	Раёны	Сіласнае будаўніцтва ў кубамэтрах: План	Пабудавана ў % да плану	Закладка сілясу (у тонах): План	Закладзена ў % да плану
	ІЛЬНА-МАЛОЧНЫЯ				
1.	Мсьціслаўскі	19.250	58,8	11.550	20,0
2.	Асьвейскі	9.550	15,2	5.730	12,7
3.	Дрысенскі	19.780	12,0	11.870	10,0
4.	Сіроцінскі	15.840	22,0	9.500	5,8
5.	Лёзьнянскі	29.860	18,8	17.930	5,1
6.	Горацкі	24.580	13,8	14.750	4,6
7.	Лепельскі	21.430	29,4	12.850	3,4
8.	Шклоўскі	22.330	42,3	13.400	2,4
9.	Сеньненскі	20.880	62,5	12.530	2,2
10.	Полацкі	31.300	41,9	18.760	1,2
11.	Гарадоцкі	32.750	21,3	19.650	1,1
12.	Расонскі	13.200	36,4	7.920	0,9
13.	Крупскі	21.780	0,7	13.070	0,6
14.	Чашускі	26.080	20,0	15.650	0,5
15.	Суражскі	18.270	0,5	10.960	0,4
16.	Дуброўенскі	15.330	0,2	9.200	0,2
17.	Бешанковіцкі	18.330	7,0	11.000	—
18.	Талочынскі	24.300	29,7	14.580	—
	Разам па раёнах	438.270	21,8	262.960	3,1
	ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-БУЛЬБЯНЫЯ				
1.	Клімавіцкі	32.820	45,3	19.690	10,8
2.	Ч.-Слабодзкі	16.300	6,4	9.780	5,3
3.	Чачэрскі	14.570	5,9	8.500	4,9
4.	Церахаўскі	22.620	10,6	13.570	4,5
5.	Барысаўскі	33.070	19,0	19.840	2,7
6.	Пухавіцкі	43.580	2,2	26.150	1,9
7.	Б.-Капцялёўскі	18.970	30,9	11.380	1,8
8.	Уваравіцкі	30.780	18,5	18.470	1,6
9.	Лагойскі	21.600	9,3	12.960	1,9
10.	Касьцюковіцкі	46.020	28,5	27.610	1,3
11.	Слуцкі	36.220	24,8	21.730	0,5
12.	Асіпавіцкі	19.670	10,7	11.800	0,5
13.	Заслаўскі	21.080	10,4	12.650	0,5
14.	Чэрпеньскі	27.000	5,5	16.200	0,3
15.	Дзяржынскі	43.330	14,1	26.000	0,2
16.	Ч.-Польскі	19.450	7,0	11.670	0,1
17.	Бярозінскі	24.050	0,1	14.430	0,1
18.	Капыльскі	27.130	0,1	16.280	0,1
19.	Кармянскі	19.870	41,6	11.920	—
20.	Плешчаніцкі	22.130	25,7	13.280	—
21.	Чэрыкаўскі	20.270	19,7	12.165	—
22.	Клічаўскі	27.670	15,1	16.800	—
23.	Вузьдзенскі	18.150	13,2	10.890	—
24.	Рагачоўскі	35.280	12,4	21.170	—
25.	Ст.-Дарожскі	22.830	2,0	13.700	—
	Разам па раёнах	848.850	12,3	509.310	1,2
	ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-НАНАПЛЯВОДЧЫЯ				
1.	Камарынскі	23.670	12,8	14.200	10,7
2.	Ельскі	27.820	29,2	16.700	10,4
3.	Нараўлянскі	28.820	14,5	17.290	9,4
4.	Жыткавіцкі	18.500	13,5	11.100	6,1
5.	Тураўскі	16.170	8,3	9.700	6,9
6.	Хойніцкі	40.420	1,6	24.250	1,3
7.	Старобінскі	35.120	21,4	21.070	1,0
8.	Мазырскі	40.300	1,4	24.180	0,9
9.	Лельчыцкі	18.330	13,4	11.000	0,7
10.	Парыцкі	31.000	0,3	18.600	0,3
11.	Пятрыкоўскі	38.070	20,5	22.840	0,1
12.	Лоеўскі	17.480	30,3	10.490	—
13.	Любаньскі	28.500	22,4	17.100	—
14.	Рэчыцкі	39.170	12,8	23.500	—
15.	Глускі	34.630	0,2	20.780	—
	Разам па раёнах	453.500	12,1	272.100	2,7
	САДОВА-ГАРОДНЯЯ				
1.	Аршанскі	40.980	30,0	24.590	3,5
2.	Бабруйскі	38.730	14,2	23.230	3,8
3.	Віцебскі	37.710	35,4	22.620	2,2
4.	Гомельскі	37.460	21,4	22.470	0,2
5.	Менскі	61.200	17,5	36.720	1,1
6.	Магілеўскі	43.300	6,8	26.000	—
	Разам па раёнах	259.380	27,4	155.630	1,8
	Разам па БССР	**2.000.000**	**18,2**	**1.200.000**	**2,3**

Заўвага: Раёны: **Вушацкі, Чашніцкі, Бялыніцкі, Быхаўскі, Прапойскі, Крычаўскі, Смалявіцкі, Бягомльскі, Ветка́ўскі, Брагінскі** у зводку ня ўключаны, як ня даўшыя вестак.

Пасеўбюро НКЗБ — ТАРАСЕВІЧ.

Лёзьняншчына не гатова да сіласаваньня

ЛЁЗНА. (Наш кар.).

Раньняе сіласаваньне пустазельля, асакі, аеру, у Лёзьнянскім раёне праведзена далёка не ва ўсіх калгасах і саўгасах. План сіласаваньня на 10 жніўня выкананы на 5,1 проц., замест патрэбных 25 проц.

Ці ўсё гатова да сіласаваньня? Паводле вестак райза ў калгасах ёсьць 196 ям. Колькі-ж новых ям пабудавана, колькі будуецца, колькі адрамантавана старых, на якую колькасьць масы—аб гэтым райза нічога ня ведае.

Ёсьць агульна-раённы плян — засіласаваць 18 тыс. тон, выкапаць новых ям і адрамантаваць старых на 26.210 кбм. А як гэты плян выконваецца ў разрэзе кожнага калгасу, кожнага сельсавету — невядома.

У калгасе **«Іскра»,** Чарнецкага сельсавету, праўленьне разважае:

— Няма месца дзе капаць ямы... вада ідзе з гліны...

МТС нічога не зрабілі для таго, каб разьбіць гэтыя апартуністычныя тэорыі і дапамагчы калгасу ад разважаньняў перайсьці да справы.

У калгасе **«Бальшавік»,** Чарнецкага сельсавету, зьбіраюцца выкапаць яму на бульбяным масыве. У яму спусьціць зруб. Гэта і практычна і эканомна і патрабуе значна менш працадзён, чым калі абгаражваць яму плетнем. Аднак, пакуль усё гэта толькі «мер каваньне», праўленьне ўсё яшчэ зьбіраецца... Гэты калгас таксама абслугоўваецца МТС.

Калгас **«Блізбожнік»,** Вунаўскага сельсавету, павінен закласьці ў ямы 95 тон сіласу, але старыя ямы не адрамантаваны, а новыя ня выкапаны. У калгасе спадзяюцца па сена, бо сенажацяй у іх многа, многа і... пакошаных.

Там, дзе важнасьць сіласаваньня ацэнена, знайшлі што сіласаваць. Калгас **«Шлях да сацыялізму»,** Глодашскага сельсавету, засіласаваў ужо каля 100 тон пустазельля і асакі. Калгас **«Полымя»,** Добрамысьлянскага сельсавету, засіласаваў 30 тон раньняй вікі (сілас для сьвіней СТФ) і ўсю асаку. Усяго будзе закладзена ў ямы 170 тон.

Калгас **«Інтэрнацыянал»** Горбаўскага сельсавету, абавязаўся закласьці ў ямы 120 тон раньняга сілясу, але ня выканаў свайго абавязацельства. Засіласавана толькі 43 тоны.

Узорны прыклад падрыхтоўкі і правядзеньня сіласаваньня паказвае калгас імя **Варашылава, Вунаскага сельсавету.** Калгас павінен сіласаваць 130 тон. Праўленьне вы значыла месца для сіласнай ямы блізка да скотнага двара. Для капаньня ямы вылучылі брыгаду з 10 чал., якія разьбіліся на групы па 3-4 калгаснікі ў кожнай. Кожная група змагалася за выкананьне сваёй нормы—5 кбм. на чалавека. Дзякуючы правільнай арганізацыі працы, нормы перавыконваліся. Напрыклад, група Шміганьнікава, Паўлоўскага і Вішнеўскага за адзін дзень выканала 44 кбм., нормы перавыкананы больш, чым у 2 разы.

Па прыкладзе калгасу імя Варашылава, усе астатнія калгасы Лёзьняншчыны павінны на-баявому разгарнуць правядзеньне сіласаваньня.

Цыркуляры замест практычнай дапамогі

Чырвонапольскі раён павінен засіласаваць 11 тыс. тон зялёнай масы. Чэрвеньскі і ліпеньскі пляны сіласаваньня сарваны. У зводках райза лічыцца засіласаваных па раёне кармоў усяго... 3 тоны. У некаторых калгасах наглядаецца яўна апартуністычная недаацэнка такога важнага мерапрыемства, як сіласаваньне.

— Сёлета сіласаваць ня будзем, бо ў мінулым годзе сілас пратух,—вось разважань ні, якія можна чуць у калгасах **«Парыская Камуна», «Барацьбіт».** Партыйная ячэйка, камсамол і аграномы не далі адпору гэтым апартуністычным разважаньням, не растлумачылі калгаснікам, што вінават тут ня сілас, а праўленьні калгасаў, якія аднесьліся да закладкі сілясу абыякава.

● Райземадзел, які павінен быць апорацыйным штабам па кіраўніцтву стварэньнем кармовай базы, замест практычнай дапамогі калгасам у тэхніцы сіласаваньня абмежаваўся толькі шырока-вяшчальнымі цыркулярамі. Камсамольскія ячэйкі таксама не аказваюць ніякай дапамогі праўленьням калгасаў.

З.

Р. КРАСЬНЕЎСКІ

ШТО МЫ БЯРЭМ І АД ЧАГО АДМАЎЛЯЕМСЯ Ў ЯНКІ КУПАЛЫ

(Да 50-цігодзьдзя з дня нараджэньня)

«Лёзунг чорнага перадзелу, або зямлі і волі—гэты распаўсюджаны лёзунг сялянскай масы, забітай і цёмнай, але якая горача шукала сьвятла і шчасьця—буржуазны».

(**Ленін**, 1905 г., т. VIII, стар. 104).

«Арэ мужык поле
Не сваё, а пана...
Бо сваёй зямелькі
Так ня многа мае»

(Янка Купала, т. 1 стар. 49).

Беларускаму народнаму паэту **Янку Купале** споўнілася 50 год. Імя і асноўныя творы пісьменьніка належаць да мінулага Беларусі. З 6 тамоў збору яго твораў, прынамсі добрых 5, па сваіх тэмах, думках і пачуцьцях належаць да гэтага мінулага. Янка Купала (Луцэвіч) зьвязан сваёй творчасьцю з адным з важных пэрыядаў у гісторыі беларускай літаратуры—пэрыядам буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі 1905—17 г. г.

У артыкулах У. І. Леніна аб творчасьці Л. Талстога даны бліскучы ўзор марксыцкай прынцыповасьці і канкрэтнасьці пры дасьледваньні творчасьці пісьменьніка.

«Калі перад намі сапраўды вялікі мастак—пісаў Ленін у сваім артыкуле «Л. Талстой, як люстра расійскай рэвалюцыі,—дык некаторыя хаця-б з грунтоўных бакоў рэвалюцыі ён павінен быў адбіць у сваёй творчасьці». (Падкрэсьл. мною.—**Р. К.**).

Такім чынам, гістарычную вартасьць і мастацкасьць твораў пісьменьніка Ленін ставіў і акрэсьліваў у залежнасьці ад таго, наколькі ў яго (ці ў іх) знайшлі свой адбітак хоць-бы некаторыя з грунтоўных бакоў рэвалюцыйнага руху. Іменна так мы павінны ставіць пытаньне пры дасьледваньні творчасьці кожнага пісьменьніка і ў даным выпадку адносна творчасьці Я. Купала. Тым больш, што артыкулы У. І. Леніна пра Талстога даюць ключ да зразуменьня моцных і слабых бакоў усёй беларускай літаратуры эпохі 1905—17 г. г., прасякнутай сваімі «гістарычнымі грахамі талстоўшчыны».

***

Якія-ж тыя асноўныя прынцыповыя пытаньні, што ўзьнікаюць у сувязі з 50-цігодзьдзем Янкі Купалы?

Першае такое пытаньне—аб адносінах пралетарскай грамадзкасьці і савецкай літаратуры да творчасьці Я. Купалы і наогул да нацыянальна-літаратурнай спадчыны. У сэнсе прынцыпова-тэарытычным, рэвалюцыйны марксызм ужо даўно мае адказ на гэтае пытаньне. Бальшавікі ніколі ня былі бесклапотнымі нігілістамі ў нацыянальным пытаньні і ў пэрыватнасьці ніколі ня цураліся «нацыянальнага гонару», паколькі справа ішла аб лепшых старонках і імёнах, упісаных рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам рабочых і сялян у гісторыю нацыі, як паказаў гэта Ленін у сваім артыкуле «Аб нацыянальным гонары вялікаросаў».

Мы кіруемся ўказаньнем Леніна на тое, што «ў кожнай нацыі ёсьць дзьве нацыі», што «ў кожнай буржуазнай культуры, ёсьць дзьве культуры». «Мы—казаў Ленін— з кожнай нацыянальнай культуры бярэм толькі яе дэмакратычныя і яе сацыялістычныя элемэнты, бярэм іх толькі і бязумоўна» (падкрэсьлена ў Леніна, т. XVII, стар. 137).

Мы кіруемся тут таксама словамі тав. Сталіна аб тым, што толькі праз крытычныя ўсваеньні і ўлік нацыянальных асаблівасьцяй, можна стварыць новую культуру «нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце».

Мы прымаем усё лепшае, пасьлядоўна дэмакратычнае, што ёсьць у творах Янкі Купалы ці Якуба Коласа, і адмаўляемся ад таго, што ёсьць у іх анты-дэмакратычнага, анты-рэвалюцыйнага. Вось чаму, у прыватнасьці, мы адмаўляемся ад «спадчыны» такіх беларускіх пісьменьнікаў, як Алесь Гаруп, які, апрацаўшы мундзір белапольскага афіцэра, здрадзіў краіне беларускіх рабочых і сялян, у дні іх сьмяротнай барацьбы з клясавым ворагам.

Вось дзе ляжыць прынцыповая розьніца паміж «нацыянальным гонарам» бальшавікоў і буржуазным нацыяналізмам ілжывых «сяброў народу»—беларускіх нацдэмаў і нацыянал-фашыстаў. Няхай яны па-рапейшаму вышукваюць у Купалы містычна панаўскага «Князя-Духу», хапаючыся за ідэалістычныя, хрысьціянска-талстоўскія бакі яго творчасьці,—гэта ня зможа дапамагчы ім захаваць свой твар насьмяных упрыгожвацеляў панскага бізуну, што сьвішча яшчэ над сьпіной часткі беларускага народу, рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Нас зусім ня зьдзіўляе гэты містыцызм і панаўства нацыянал-дэмакратычнай і нацыянал-фашысцкай, так званай літаратурнай «крытыкі», узор якой дае дэфэнзыўны «прарок» і обэр-шэльма А. Луцкевіч (ён-жа А. Навіна) у сваім «Пахавальным звоне». *). Гісторыя, казаў калісьці Плеханаў, заўсёды жорстка пасьміхалася над контр-рэвалюцыйнымі клясамі, бясьсільнымі зразумець дыялектыку яе поступу, паказваючы ім сваю заднюю...

***

Другая задача, якая паўстае перад намі гэта — аналіз сацыяльнай прыроды, ідэй і пачуцьцяў паэзіі Янкі Купалы, яе моцных і слабых бакоў.

***

Я. Купала (Луцэвіч) упяршыню зьявіўся на літаратурнай арэне ў 1905 годзе, у той момант, калі на чарзе стаяла зьвяржэньне самаўладзтва паўстаўшымі рабочымі і часткаю сялянскіх мас былой Расіі. Беларусь (тады «северо-западный край») не ўяўляла сабой выключэньня в малюнку ўсеагульнага ўздыму. Не гаворачы ўжо пра гарады Беларусі, дзе рабочая кляса баставала і наладжвала палітычныя дэманстрацыі, сялянства і дробна-буржуазныя элемэнты таксама знаходзіліся ў стане рэвалюцыйных хваляваньняў.

Гэтыя, яшчэ ня зусім ясныя, але напорныя настроі сялянскіх мас Беларусі, абуджаных падзеямі 1905 году, добра перадае наступны верш Купалы:

«Сэрца б'ецца, к жыцьцю рвецца,
К нейкім сьветлым снам;
Гэй ты гора, скора-ж, скора
Цябе ў брак я адам?
К долі, к волі, гэй, па полі
Як ляў пабліку.
Спаці, ждаці, у курнай хаці
Ужо больш не магу.
...Звоніць штосьці,—к славе ў госьці
Кліча гэты звон». (т. 1, стар. 13).

Тут знайшлі сваё таленавітае выяўленьне, як лепшыя думы і надзеі сялянства ў рэвалюцыі, так і яго слабасьці, вось тыя самыя мары аб «сьветлых снох», пра якія гаварыў Ленін.

Асноўнай задачай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905 году, як вядома, было экспамічнае і палітычнае зьнішчэньне ў былой Расіі перажыткаў прыгоньніцтва, стварэньне рэспублікі з рабоча-сялянскай дыктатурай на чале для найбольш поўнага ажыцьцяўленьня дэмакратызму ў грамадзкім жыцьці і хутчэйшага прасоўваньня да сацыялістычнай рэвалюцыі. У адносінах да прыгнечаных нацый б. царскай імпэрыі асноўны сэнс буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі зводзіўся да нацыянальнага вызваленьня, да стварэньня «вольнай бацькаўшчыны».

Вось чаму бальшавікі тады прызнавалі праграсыўнасьць буржуазнай рэвалюцыі і ставілі сваёй мэтай, каб пралетарыят стаў гегемонам яе. Ленінскія словы аб тым, што тагачасная Расія больш цярпела ад перастачы капіталізму, чым ад яго лішкаў,—найбольш падыходзілі да так званага «северо-западного края». Вядома, што тагачасная патрыярхальная, пазбаўленая больш-менш буйнай прамысловасьці і захаваўшая моцныя рэшткі фэадальна-прыгоньніцкіх адносін, Беларусь яшчэ больш, чым дзе небудзь цярпела ад нелахоту капіталістычных адносін. Дадайце да гэтага самы подлы нацыянальны ўціск царскіх прышыбеевых, прыгнечаньне рэлігіі, векавую цэмру, вымаранье ад голаду,—і вам тады стане ясным аб'ектыўна-жудасны малюнак становішча вёскі 900-х гадоў.

І не выпадкова Янка Купала па-свойму паказаў гэтыя новыя супярэчнасьці ў наступных радкох:

«На што вёск зямлі хапець?
Памром—сажань будзем мець!
На што новыя нам хаты?
Казна, двор і так багаты.
На што сьвет навукі шчасная,
Калі сьпіць пасьвіць жэна?».
(Том II, стар. 176).

Адсюль будзе зразумела чаму 1905 г. і паўстаньне рабочай клясы ўзьнімалі вёску да патрабаваньня «зямлі і волі» і прымушалі яе меншую частку, як пісаў Ленін, ісьці «са зброяй у руках на зьнішчэньне сваіх ворагаў, на зьнішчэньне царскіх служак, памешчыцкіх абаронцаў». Паэзія Янкі Купалы адбівае,

Аб папулярызацыі пастановы ЦВК і СНК СССР пра ахову маёмасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў каапэрацыі, пра ўмацаваньне грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці

Пастанова сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б ад 11 жніўня 1932 г.

1. Прапанаваць парткалектывам і ячэйкам гораду чарговы партыйны сход скарыстаць для прапрацоўкі пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня г. г., увязаўшы яе з папулярызацыяй пастаноў партыі і ўраду аб узмацненьні рэвалюцыйнай законнасьці, з якіх яна выцякае.

2. Прапанаваць пад адказнасьць сакратароў сельячэек не пазьней 20 жніўня ва ўсіх калгасах і вёсках прапрацаваць і растлумачыць сярод шырокіх мас калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў і служачых, асабліва сельспажыўтаварыстваў, апошнюю пастанову ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня.

Выяжджаючым таварышом для правядзеньня ў калгасах масавага палітдня шырока папулярызаваць пастанову ЦВК і СНК СССР.

3. Прапанаваць пракуратуры і нарсудзьдзям гораду справы, зьвязаныя з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня г. г., разглядаць бяз усякай чаргі, праводзячы суды ў паказальным парадку з выездам на месцы.

4. Адзначаючы, што з боку раду парткалектываў, прадпрыемстваў гораду ня выканана пастанова ГК ад 25 ліпеня г. г. аб папулярызацыі і прапрацоўцы пастановы партыі і ўраду пра ўзмацненьне рэвалюцыйнай законнасьці на сходах рабочых,—сакратар'ят катэгарычна папярэджвае сакратароў парткалектываў і прапануе не пазьней 17 жніўня на прадпрыемствах, транспарце і ўстановах правесьці адкрытыя партсходы, увязаўшы папулярызацыю пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня з папулярызацыяй пастаноў партыі і ўраду аб узмацненьні рэвалюцыйнай законнасьці.

5. Прапанаваць фракцыі ГСПС даць указаньні фабзаўмясцкомам аб прапрацоўцы і папулярызацыі пастановы ЦВК і СНК СССР сярод шырокіх рабочых мас.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б — ШПЭКТАРАЎ.

НАДЫХОДЗІЦЬ АДКАЗЬНЕЙШЫ ПЭРЫЯД У РАБОЦЕ ТРАНСПАРТУ

Сустрэць асеньня-зімовыя перавозкі поўнасьцю падрыхтаванымі

Неадкладна падцягнуць адсталыя вучасткі

Работа чыгуначнага транспарту ў ліпені не дала ніякага паляпшэньня. Большасьць асноўных паказальнікаў ня выкананы. У прыватнасьці, трэба падкрэсьліць зрыў сярэднясутачнай нагрузкі па ўсіх раёнах (апрача Аршанскага, які выканаў плян на 100,6 проц.) і нездавальняючы стан паравознай і вагоннай гаспадаркі.

Плян сярэднясутачнай нагрузкі ў ліпені па **Гомельскім** раёне выкананы на 88,4 проц., **Жлобінскім** — 99 проц., **Віцебскім**— 93,3 проц.

Поўнае скарыстаньне чыгуначнага транспарту ў летнія месяцы мае ня менш адказнае значэньне, чым у асеньня-зімовыя. Трэба памятаць, што поўнасьцю загружаючы транспарт у летні перыяд, мы палягчаем выкананьне плану асеньня-зімовых перавозак. Неабходна дабіцца таго, каб чыгунка да пэрыяду найбольш напружанай работы па перавозцы с.-г. грузаў і матар'ялаў для будаўніцтва максымальна павялічыла летні завоз тавараў, каб не загружаць ім транспарт у асеньня-зімовы час.

Між тым, як відаць з вышэйпаданых лічбаў, нормы нагрузкі ў ліпені па чыгуначных раёнах БССР ня выконваюцца. Гэта гаворыць перш за ўсё аб аслабленьні тэмпаў работы чыгуначнага транспарту і, па другое, аб злачынна нядбайных адносінах кліентуры да загрузкі транспарту.

Зусім нецярпімым зьяўляецца нагаршэньне станоўвіча вагоннага і паравознага парку. Па **Жлобінскім** раёне процант хворых паравозаў перавышае нормы па 4 проц., па **Віцебскім** — на 3 проц., па **Аршанскім** —па 1 проц. Толькі адзін **Гомельскі** раён дасягнуў зьніжэньня нормы хворых паравозаў на 1 проц.

Рост хворых паравозаў па большасьці раёнаў ёсьць просты вынік невыстарчальнай мабілізацыі мас з боку чыгуначных арганізацый на падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак, ёсьць просты вынік слабай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна і дрэнна пастаўленай масавай работы.

11,6 проц. хворых вагонаў на **Віцебскім** раёне, 7,15 проц. на **Жлобінскім** і 7,6 проц. на **Аршанскім**—гэта нічым не апраўданыя гаковыя лічбы. **Гомельскі раён** хаця параўнаўча і мае меншы процант хворых паравозаў—2,2 проц., аднак перавышае ўсё-ж норму ў 0,8 проц.

Усё гэта ёсьць вынік адсутнасьці сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю загаду наркома тав. Андрэева аб аздараўленьні вагоннага парку, адсутнасьці барацьбы за ліквідацыю асноўнай прычыны дрэннага становішча вагоннай гаспадаркі — абязьлічкі. Да гэтага часу абязьлічка існуе яшчэ як у рамонце, так і ў доглядзе за вагонамі. З гэтым трэба рашуча пакончыць. Рэалізацыя загаду тав. Андрэева патрабуе сапраўды ўдарных тэмпаў у рабоце, сапраўднай канкрэтнай перабудовы работы і апэрацыйнага кіраўніцтва.

Бальшавіцкі адпор апартуністам, якія спасылаючыся на немагчымасьць ліквідацыі абязьлічкі ў вагоннай гаспадарцы і, перашкаджаюць яе аздараўленьню. Чыгуначныя арганізацыі на чале ўсіх чыгуначнікаў БССР, пад кіраўніцтвам партыі павінны паказаць узоры падрыхтоўкі да адказьнейшага пэрыяду ў рабоце чыгункі—асеньня-зімовых перавозак.

Аршанскія чыгуначнікі рэалізуюць абавязацельствы, узятыя да юбілею „Зьвязды"

ЦК КП(б)Б, ЧПАР'у, дарпарту, ЦК чыгуначнікаў, дырэктару дарогі, Дарпрафсачу і рэдакцыям газэт „Гудок", „Зьвязда" і „Рабочий"

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, рабочыя і ІТР чырвонасьцяжнага Аршанскага дэпо 10 жніўня г. г. датэрмінова выканалі заданьне па спэцрамонце паравозаў. Прапушчана праз спэцрамонт 39 паравозаў, пры заданьні ў 34. Запэўніваем, што дамо лепшыя паказальнікі ў далейшай рабоце і забясьпечым бесьперабойную работу дэпо ў часе асеньня-зімовых перавозак.

Начальнік дэпо — **Барысаў.**
Сакратар парткалектыву—**Фядулаў.**
Старшыня МК цягі — **Якушаў.**

Пяты акалодак ідзе ўперадзе

Рабочыя 5-га акалодку 11-й дыстанцыі шляху (станцыя Менск) ва час уключэньня ва ўсесаюзны конкурс па падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак дабіліся раду посьпехаў. У тэрмін і ліпені значна перавыконваўся плян па зьмене шпал. Наогул, па рабоце, зьвязанасьці з падрыхтоўкай да асеньня-зімовых перавозак, 5-ты акалодак заняў першае месца па дыстанцыі, перавыканаўшы на 7 жніўня агульны плян на 38 проц.

З мэтай таварыскай дапамогі 2-му акалодку, дзе выявіўся значны чрарыў, рабочыя выслалі 6-га жніўня сваю брыгаду ў ліку 16 чалавек.

Посьпехі 5-га акалодку тлумачацца добра наладжанай масавай работай сярод чыгуначнікаў, у выніку чаго шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва.

Кашэль.

Ліквідаваць разрыў паміж колькасьцю і якасьцю рамонту

Падрыхтоўка паравознага парку да асеньня-зімовых перавозак вызначаецца ня толькі колькасьцю выпушчаных з рамонту паравозаў, але і якасьцю гэтага рамонту. Між тым, у радзе выпадкаў тут ёсьць поўны разрыў.

Так, Гомельскае дэпо па колькасьці як быццам перавыканала плян спэцыяльнага і заводзкага рамонту паравозаў: да 15 жніўня трэба прапусьціць 43 паравозы, а на 1 жніўня ўжо прапушчана 46. Але-ж якасьць гэтага рамонту прымушае жадаць шмат лепшага.

За ліпень, напрыклад, было 14 паўторнасьцяй, прычым дзьве з іх прыпадаюць на паравозы, што прайшлі спэцрамонт. Ёсьць выпадкі, калі паравозы пасьля заводзкага рамонту маюць па 50 дэфэктаў.

Прывезеныя факты сьведчаць аб неразуменьні дэпаўскіх і заводзкіх арганізацый важнасьці барацьбы за якасьць. Трэба памятаць, што дрэнна адрамантаваны паравоз зьнішае эфэкт агульнага выкананьня плану рамонту, што нізкая якасьць зрывае і колькасныя дасягненьні. Вакол пытаньня павышэньня якасьці рамонту павінна быць разгорнута значная масавая работа. **Баявая задача рамонтнікаў рамантаваць ня толькі хутка, але і высокаякасна.**

М. А.

ПРАМЫСЛОВАЯ АРЦЕЛЬ ІМЯ КРУПСКАЙ ПА-УДАРНАМУ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ШЫРСПАЖЫУ,

ЯНА ПОЎНАСЬЦЮ ПЕРАКЛЮЧЫЛАСЯ НА СКАРЫСТАНЬНЕ ЎТЫЛЬАДКІДАЎ

Зводка выкананьня дадатковай праграмы па шырспажыву па Наркамлёгпраму за ліпень месяц

(у тыс. руб. і проц.).

Галіны прамысловасьці	Ліпеньскі плян	Фактычн. выпрац.	Проц. выкананьня
1. ШКЛЯНАЯ	53,5	55,9	104,4
2. СКУРАНАЯ	19,1	19,2	101,0
3. АБУТКОВАЯ	27,1	26,7	98,5
4. ПАЛІГРАФІЧНАЯ	41,1	36,6	89,1
5. ШВЭЙНАЯ	554,8	396,2	71,3
Разам	950,6	702,4	73,9

Як паказвае зводка, вынікі выкананьня дадатковай праграмы па вырабу тавараў шырокага спажываньня прамысловасьцю Наркамлёгпраму за ліпень нездавальняючыя. Замест на 950 тыс. руб. прадукцыі, выпушчана толькі на 702 тыс. руб. Асабліва адстае швэйная прамысловасьць, якая выканала вытворчы плян усяго на 71,3 проц.

Асобныя швэйныя прадпрыемствы амаль не разгарнулі работы па шырспажыву. Так, фабрыка ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА свае заданьне выканала толькі на 10,3 проц., «8 САКАВІКА» — на 16 проц., «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» — на 23 проц.

Упарадзе ўсіх ідзе ШКЛЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, ЯКАЯ СВАЮ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ ВЫКАНАЛА НА 104,4 ПРОЦ. ГУТА «ПРАЛЕТАРЫ» ЗА ЛІПЕНЬ ДАЛА 425 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Здавальняючыя вынікі паказвае АБУТКОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, якая выканала ліпеньскі плян на 98,5 проц., прычым МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ДАЛА 115,3 ПРОЦ., ВІЦЕБСКАЯ — 100 ПРОЦ. І ГОМЕЛЬСКАЯ — 121 ПРОЦ.

Паліграфічная прамысловасьць свой плян выканала на 89,1 проц. Адстаюць ў гэтай галіне вытворчасьці ПАЛЕСДРУК, які даў толькі 55,7 проц. і ШКАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА — 58,5 проц. Добрыя вынікі работы па вырабу шырспажыву дала ДРУКАРНЯ ІМЯ СТАЛІНА, якая свой плян выканала на 192 проц.

Такім чынам вынікі наглядна сьведчаць аб тым, што там, дзе фабрычна-заводзкія арганізацыі па-бальшавіцку пераключыліся на разгортваньне вырабу тавараў шырокага спажываньня, шляхам максымальнага выкарыстаньня адкідаў, — там мы маем станоўчыя паказальнікі. Там-жа, дзе, як і раней, гэты важнейшы вучастак недацэньваецца — там вырабы тавараў ідзе чарапашымі тэмпамі.

Тав. Рыўкін — лепшы ўдарнік дрэваапрацоўчага заводу імя Молатава, загадчык зборачнага аддзяленьня уцільцэху

Кандыдат на ўсесаюзную прэмію

Менская трыкатажная прамысловая арцель імя Крупскай арганізавалася ў 1926 годзе. Спачатку арганізацыі многія члены арцелі — былыя саматужнікі — працавалі па дамох. Адсутнічалі асобныя вытворчыя працэсы. Якасьць прадукцыі была зусім нізкая.

З вялікай цяжкасьцю прышлося зьбіраць усіх членаў арцелі ў агульную майстэрню.

Спачатку 1932 году арцель пачала перабудоўваць сваю работу. Не хапала віскозы і трыкатажных іголак. Трэба было прыстасоўвацца да работы так, каб менш ужываць дэфіцытны сырэц і трыкатажныя іголкі.

Апошнія пастановы партыі і ўраду аб разгортваньні вырабу тавараў шырокага спажываньня выклікалі новы ўздым энтузіязму з боку членаў арцелі. Арцель поўнасьцю пераключылася на выраб тавараў шырокага спажываньня выключна з адкідаў. Праведзена вялікая работа па арганізацыі працы. Калі ўваходзіш у цэхі, дык відаць, што там працуюць па-новаму. На кожнай машыне напісаны прозьвішчы тых, за кім яны замацаваны. На сьценцы вывешана норма выпрацоўкі.

Усе вытворчыя працэсы амаль поўнасьцю пераведзены на канвэерную сыстэму. У матальным цэху — наматваецца віскоза і пража на шпулькі швэймашыны. У вязальным — вытворчым сырцы арцелі — з віскозы і пражы робяцца дэкэмпры, жаночыя гарнітуры, блюзкі, кашнэ і шапачкі. Нічога ня гіне дарма.

На хаду выпраўляючы памылкі, члены арцелі ўпосьпех свае напраўкі, каб дабіцца максымальнага выкарыстаньня сырцу. Член арцелі **Барыс Елішкевіч унёс прапанову вырабляць з кавалкаў каўняры. Па яго-ж прапанове з адкідаў наладжан выраб дзіцячых рэйтуз і сукенчак.** Работніца **Капылевіч** унесла прапанову аб скарыстаньні бракаваных панчох, якія раней проста выкідаліся, а зараз з іх вырабляюцца прыгожыя дзіцячыя сукенчкі і фескі. Па прапанове падростка **Лёвы Губічава** з рошткаў кашнэ, якія раней таксама выкідаліся, зараз робяцца паясы.

Арцель заключыла дагавор на 500 тыс. руб. з Віцебскай трыкатажнай фабрыкай на атрыманьне адкідаў і бракаваных панчох. З 2-3 бракованых панчох робіцца адна пара добрых. З адкідаў гумова-тканкіх фабрык вырабляецца гума для падцяжак і вузкая — для капялюшоў.

Арцель знаходзіцца ў стадыі свайго далейшага разьвіцьця. Папыраецца гумова-ткацкіх цэх, уводзяцца ў строй дзьве новыя машыны зробленыя непасрэдна ў самой арцелі. Для абслугоўваньня працоўных гораду адкрыты пачынчыя майстэрні, дзе робіцца рамонт трыкатажных вырабаў: джэмпраў, сьвідраў, панчох, шкарпэтак і інш. Апрача таго, арцельцю арганізаваны абменныя пункты, дзе за 3 пары старых рэчаў даюць адну пару новых.

Камсамольцы ў арцелі зьяўляюцца застрэльшчыкамі ў правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. Па ініцыятыве камсамольцаў пасьпяхова закончана падпісная кампанія на пазыку «4 заключны», якой ахоплена 100 проц. членаў арцелі. Камсамольцы таксама зьяўляюцца ініцыятарамі сацпаборніцтва і ўдарніцтва ў цэхах і брыгадах. Яны дабіліся сваячасовага давядзеньня да кожнай брыгады вытворчых заданьняў, якія вывешваюцца на спэцыяльных дошках, разам з самаабавязацельствамі па сацдагаварох. Паміж брыгадамі разгорнута сацпаборніцтва на заваяваньне пераходнага сьцягу. Калі ў чэрвені сьцяг быў заваяваны брыгадай **Машы Лезінай**, дык зараз ён перайшоў у брыгаду тав. **Шульман. Барацьба за атрыманьне пераходнага сьцягу зьяўляецца справай гонару кожнага члена арцелі.**

Уключыўшыся ва ўсесаюзны конкурс на лепшую арцель па разгортваньні вырабу тавараў шырокага спажываньня, арцель на падставе сустрэчных пляноў цэхаў і брыгад вызначыла дадатковую праграму па выпуску тавараў на 500 тыс. руб., што разам з асноўным складае 2.300 тыс. руб.

Калі на канфэрэнцыі менскіх ударнікаў арцель **атрымала пераходны сьцяг Менпрамсаюзу**, арцельшчыкі заявілі, **што яны будуць яшчэ больш моцна змагацца за выкананьне і перавыкананьне пляну,** што атрыманы сьцяг нікому не аддадуць.

Сваё абяцаньне арцель выконвае з гонарам. **За першае паўгодзьдзе плян выканан на 123 проц. Ліпеньскі — разам з сустрэчным — на 105 проц.** Такіх вынікаў арцель дабілася дзякуючы ўпартаму змаганьню за практычнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна. Праўленьне арцелі добра зразумела, што палепшэньне быту арцельшчыка — важнейшая ўмова пасьпяховага выкананьня і прамфінпляну. Арцель першай у Менску арганізавала самастойную сталовую, у якой кожны член арцелі атрымлівае за таную цану добраякасныя абеды. Прадукты сталоўка набываюцца ў парадку самазагатовак. При арцелі ёсьць мэдыцынскі пункт, які абслугоўвае мэдыцынскай дапамогай усіх яе членаў. Зараз увага арцелі накіравана на арганізацыю сваёй крамы. Вядуцца перагаворы на конт памяшканьня: у бліжэйшыя дні крама павінна быць адкрыта. Праводзяцца самазагатоўкі гародніны і садавіны, каб даць неабходныя прадукты арцельшчыкам па танных цэнах і гэтым самым узьняць рэальную зарплату.

Арцель імя Крупскай зьяўляецца узорам таго, як трэба прадаваць і скарыстоўваць усе вытворчыя магчымасьці для павялічэньня выпуску тавараў шырокага спажываньня. **Вопыт яе работы трэба пашырыць на ўсе прамысловыя арцелі БССР. Менпрамсаюз і рэдакцыя шматтыражкі «За ўдарную арцель» высоўваюць яе кандыдатам на ўсесаюзную прэмію.**

Д. Кугэль

Чаму адстае завод

(Ліст рабочага)

Значэньне нашага **Гомельскага маргарыкавага** заводу ўсім вядома. Толькі вось завод не ажыцьцяўляе ўскладзеных на яго надзей. Ён ня выходзіць з паласы прарыву.

Я тут прыводжу некаторыя факты, якія тармозяць работу нашага заводу.

Работніца **Фэйгіна** сваёй нядбайнасьцю прыносіць заводу вялікія страты. Аднойчы яна з-за нядбайных адносін да сваіх абавязкаў сапсавала 5.000 літраў малака, другім разам яна спусьціла ў каналізацыю 2.000 літраў малака. І такая работніца, на жаль, не адзіная.

Шмат тлустасьці ўцякае ў каналізацыю, бо адзін работнік, які працуе каля студні, не спраўляецца вылоўліваць гэту тлустасьць.

Ёсьць цэлы рад самых злачынных адносін некаторых рабочых да сваіх абавязкаў.

Такі факт, як кошт маргарыну, паказвае пакольки мы яшчэ дрэнна працуем. Адзін кілёграм маргарыну па дзяржаўнай цане павінен каштаваць **1 руб. 85 к.**, а ў нас ён каштуе **3 руб. 20 к.**

Што-ж робіць наша адміністрацыя і заводзкія арганізацыі для паляпшэньня работы заводу? Адміністрацыя больш занята асабістымі справамі, чым наладжваньнем работы заводу. Напрыклад, нам. дырэктара **Драгунскі** разбазарыў 10 скрынак пячэньня. Ёнжа разбазарыў і іншыя прадукты. Пад яго кіраўніцтвам наладжваюцца банкеты за кошт прадуктаў, якія адпускаюцца для рабочых.

Рабочыя ўсё гэта добра ведаюць і гавораць аб гэтым на ўсіх сходах. Але іх словы не знаходзяць рэагаваньня з боку парткалектыву заводу.

Вальнскі.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад гомельскай гарКК-РСІ паведамленьня па гэтым лісьце.

Наша сталоўка працуе дрэнна

(Ліст рабочага)

Калі вы зойдзеце па тэрыторыю **фабрыкі «Кастрычнік»** (Менск) у часе абедзенага перапынку, дык заўважыце такі малюнак: як толькі зазвоняць на абед, рабочыя бягуць у сталоўку, як на пажар. Трэба як мага хутчэй стаць у чаргу, каб атрымаць талён. На абед даецца толькі 40 мінут і калі хто спозьніцца стаць учаргу, дык ён можа застацца без абеду.

Атрымаўшы талён, заходзіш у сталоўку. Табе здаецца, што ты трапіў не ў сталоўку, а на якісьці базар. Шум, крык, стук, — усё гэта стварае надзвычайны гармідар.

Рабочыя вельмі часта не задаволены і сварацца з-за таго, што купіўшы, скажам, талён на мясную страву, атрымліваюць рыбную. Адпойчы купілі мы мясныя талёны. Калі селі за стол, нам заявілі: **«Мяса няма, ідзе це перамянеце талёны на рыбу».** Мы пайшлі да касы. Стаялі ў чарзе. Перамяніўшы талёны, зноў селі за стол. Тады нам зноў заявілі: **«Рыбы няма, зараз будуць гатовы манныя катлеты».** Пакуль мы мянялі талёны, перапынак на абед скончыўся і мы засталіся без абеду. У той дзень шмат хто з рабочых пашоў на работу без абеду. На вялікі жаль, такіх дзён у нас бывае вельмі многа.

У касе сыстэматычна не даюць 1-2 капейкі рошты. Касір тлумачыць гэта тым, што няма дробных грошай. Рабочыя гэтым падчасьць Купалы (нават з пункту гледжаньня перадавога сялянскага ідэолёга) значна ніжэй, чымся творчасьць, напрыклад, Някрасава (хаця-ж бы ў галіне разуменьня капіталістычных адносін у вёсцы). Далей, паўнасьць талстоўскага фаталізму ў Купалы ёсьць таксама і суб'ектыўны недахват, зьвязаны з тым, што Купала, які знаходзіўся і выхоўваўся ў патрыярхальна-адсталых умовах, не стаяў на ўзроўні перадавых ідэй свайго часу. Больш таго, у Купалы мы знаходзім вельмі часта такі ўпадак духоўных сіл, такі пэсымізм, які мяжуецца часта з поўным адмаўленьнем ад якой бы там ні было барацьбы. Тады—адзіным матывам для пратэсту ў яго становіцца «магіла і сьмерць».

А як нам зоркі загаснуць,
А шкі думка аб праўдзе
Ня ўзьдзене плесьні-сінізны,
Будзе несьці свае ношы
К ціхім мальбішчам айчызны.
(т. I, стар. 200).

Або яшчэ прыклад:

Ідуць усе і я за ўсімі
Зыду з шудой, бядой сваёй,
Так цяжка жыць памёж жывымі,
У магіле будзе мо' лягчэй.
(т. I, стар. 212).

Было-б няправільна бачыць гэтую прастрацыю духу толькі ў палітычнай рэакцыі часу: суб'ектыўны ідэалізм і містыцызм Я. Купалы тут таксама выступае досыць выразна.

Мы не абвінавачваем паэта за тое, што ён ня меў магчымасьці мець сталую навуковую асьвету («Мне мудрасьці кніжнай ня даў бог пажаці»). Справа ідзе аб прынцыпова-клясавым сьветаногляде паэты і тут ужо мы ня можам не адзначаць яго ідэалізм і містыцызм. Бо мы памятаем добра, што «галоўная задача,—пісаў Ленін у 1905 годзе,—**унесьці палітычную сьвядомасьць у сялянскі рух**». (т. VII, стар. 278). Такія-ж вершы, як вышэйпаданыя, **зразумела, не могі садзейнічаць узросту гэтай сьвядомасьці.**

(Канец у наступным нумары).

«оямлі і волі», або «вольнай бацькаўшчыны»—былі буржуазнымі ідэаламі. Янка Купала, дробна-буржуазны дэмакрат, мог гэтага ня ведаць і папраўна ня ведаў, калі ацэньваў іх у сваіх вершах. Але гэта не зьмяняе аб'ектыўна гістарычнага і сацыяльнага сэнсу дамаганьняў сялянства— г. зн. іх буржуазна-капіталістычнага характару. Паколькі Купала так ці інакш выяўляў і прапагандаваў памянёныя лёзунгі сялянскіх мас, настолькі ён аб'ектыўна служыў прагрэсыўнаму **«амэрыканска-фэрмэрскаму» шляху разьвіцьця Беларусі.**

Восьць гэтая акалічнасьць выдзяляе Я. Купалу **ПЕРШАГА ПЭРЫЯДУ** з радоў так званага нацыянальства, якое па сваёй сацыяльнай палітычнай сутнасьці, было нічым іншым, як беларускім праяўленьнем агульна-расійскага лібэральна-кадэцкага «прусацтва» і сталыпінщыны,—але аб гэтым ніжэй.

***

Пад адмоўнымі бакамі творчасьці Купалы першага пэрыяду, мы разумеем наяўнасьць досыць моцнага струменю містыцызму, папоўнічыны, нацыяналізму, талстоўскай пакорнасьці, варожасьці да гораду, рамантызацыі фэадальнага мінулага і г. д. Усе гэтыя рысы ўжо ёсьць у «Жалейцы» і «Гусьляры», але нарастаюць асабліва ў такіх пазьнейшых творах Купалы, як «Адвечная песьня», (1910 г.) «Раскіданае гняздо», «Сон на Кургане» (1913 г.), філёзофія якіх лёгічна прывяла Купалу да славутага вершу «Прарок», ахарактарызаванага Д. Бедным «змеиным шипом» супроць пралетарскай рэвалюцыі. Пад уплывам якіх прычын праходзіла гэтая эвалюцыя Купалы? Прычыны былі як суб'ектыўнага, так і аб'ектыўнага парадку. На апошнія мы ўжо паказвалі вышэй, гаворачы аб палітычнай адсталасьці сялянства Беларусі, яго слабай клясавай разьмежаванасьці, тэй сьлічцы, на якую так часта скарджыўся сам паэт, і паронце, буржуазнасьці саміх ідэалаў і лёзунгаў сялянства. Але меліся прычыны суб'ектыўнага парадку, якія часта стаялі твор

Канец у наступным нумары.

ЦП саюзу гарбароў „дапамагае" рэзалюцыямі

Выраб прарметаў шырокага спажываньня на Менскай гарбарні «Бальшавік» стаў справай усёй рабочай грамадзкасьці. Парткалектыў і заўком разгарнулі шырокую растлумачальна-масавую работу сярод рабочых вакол пытаньня шырспажыву. Ва ўсіх цэхах і брыгадах праведзены сходы па абмеркаваньні гэтага пытаньня. Некаторыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па вырабу тавараў шырспажыву. Напрыклад, брыгада **дасьцільшчыкаў 2-га хромавага цэху**, дзе да гэтага часу выкідалася шмат абрэзкаў скуры, узяла на сябе абавязак зьбіраць гэтыя абрэзкі для ўцільцэху. Зараз брыгада дае штодня 60-80 абрэзкаў скуры. **Брыгада строгалеў** таксама абавязалася ўласнымі сіламі зьбіраць адкіды скуры, якія раней не скарыстоўваліся.

З 15 ліпеня распачаў работы па выпуску шырспажыву уцільцэх, які ўжо выпусьціў прадукцыі на суму каля 5 тыс. руб.

Зараз на заводзе абвешчан конкурс на збору рабочых прапаноў на лепшае скарыстаньне адкідаў. Вызначаны тры прэміі: адна ў 250 р., другая — 150 руб., і трэцяя— 100 руб. Да сёньняшняга дня сабрана звыш 10 рабочых прапаноў, адна з іх ужо ажыцьцёўлена і дае вялікую суму эканоміі.

Аднак, побач з дасягненьнямі ў рабоце ёсьць і недахопы. У прыватнасьці, для ўцільцэху не хапае кваліфікаваных рабочых, балетчыка, закройшчыка і 2-х машыністаў па строчцы загатовак. Замест 12 чалавек, якія вызначаны паводле пляну, у цэху працуе 8.

ЦП саюзу гарбароў, заслухоўваючы справаздачу дырэктара заводу аб становішчы работы па шырспажыву, абяцала дапамагчы ў справе ўкамплектаваньня ўцільцэху рабочай сілай. Напісалі прыгожую рэзалюцыю, якая застаецца толькі на паперы.

М.

Разгарнуць работу па датэрміновым зборы с.-г. падатку

Закон аб сельска-гаспадарчым падатку мае вялізарнае значэньне ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, павышэньня якасьці калгаснай вытвор часьці, разгортваньня калгаснага гандлю, паскараненьня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Значэньне новага закону ацэнена і прызнана шырокімі масамі саміх калгасьнікаў, якія ў адказ на закон, абвясьцілі сябе ўдарнікамі, пашырылі пасеўную плошчу і датэрмінова ўносяць с.-г. падатак. Па **Мсьціслаўскім раёне** калгасы датэрмінова ўнесьлі 34.300 руб., калгасьнікі—30.500 руб.; па **Сіроцінскім** раёне калгасы—13.600 руб., калгасьнікі—21.700 руб.; па **Аршанскім**—калгасы 36.300 руб. і калгасьнікі—1.600 руб.; па **Жлобінскім**—калгасы 6 тыс. руб., калгасьнікі—2 тыс. руб.; па **Дрыксенскім**—калгасы 5.400, калгасьнікі—500 р.

На базе новых форм сацыялістычнага вядзеньня сельскай гаспадарки значна ўзрос даход працоўнага селяніна. У выніку разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва і індустрыялізацыі краіны павялічыліся незямляробчыя заработкі сельскага насельніцтва. Усё гэта пры льготным абкладаньні калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў стварае эканамічныя магчымасьці для пасьпяховага збору сельска-гаспадарчага падатку ў найкарацейшы тэрмін.

У трэцім квартале трэба сабраць ня менш 75 проц. гадавой сумы. Гэта вялізарнай важнасьці задача можа быць пасьпяхова ажыцьцёўлена пры ўмове датэрміновага паступленьня с.-г. падатку.

У пераважнай большасьці раёнаў налічэньне падатку закончана. Разьмеры падатку вядомы кожнаму калгасьніку і аднаасобніку. Праўленьне кожнага калгасу таксама мае магчымасьць арыентовачна вызначыць тую суму, якая прылічваецца з калгасу. Трэба зараз-жа распачаць работу па датэрміноваму збору с.-г. падатку. Сацспаборніцтва па датэрміновую ўплату павінна зьявіцца асноўным мэтадам у рабоце ўсіх раёнаў. Калгасы і калгасьнікі павінны служыць прыкладам для аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, заняць вядучую ролю. Зямельныя і фінансавыя органы, райкалгас саюзы павінны аказаць калгасам канкрэтную і непасрэдную дапамогу па арыентовачным вылічэньні падатку.

Пад асобны нагляд трэба ўзяць спагнаньне падатку з кулакоў і заможнікаў. Неабходна памятаць, што падатак з кулакоў спагнаецца зараз-жа, прычым у тавар, які не жадае сваячасова заплаціць налічаную суму падатак трэба спагнаць у прымусовым парадку, шляхам продажы адпаведнай часткі маемасьці. Неабходна ўстанавіць выключна пільны нагляд за захаваньнем апісанай маемасьці кулака, каб ня даць апошняму яе разбазарваць.

Задачы, пастаўленыя ў 1932 годзе плянам мабілізацыі сродкаў на ажыцьцяўленьне праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуюць хутчэйшага збору с.-г. падатку, таму яго трэба сабраць датэрмінова. Так трэба ставіць задачу ў кожным раёне, сельсавеце, калгасе.

М. Тайц.

ЗА МЯЖОЙ

Гіндэнбуог адхіліў патрабаваньне Гітлера

БЭРЛІН, 14. Апублікавана афіцыяльнае паведамленьне аб каротказтэрміновай гутарцы паміж прэзыдэнтам Гіндэнбургам і Гітлерам, якая, як вядома, закончылася бязрэзультатна. Ад нацыянал-сацыялістаў у гэтай гутарцы прымалі таксама ўдзел **Фрык** і **Рэм**.

У афіцыяльным паведамленьні падкрэсьліваецца, што Гіндэнбург задаў Гітлеру пытаньне, ці гатоў ён, а таксама і іншыя прадстаўнікі нацыянал-сацыялістыкай партыі, увайсьці ў склад габінэту фон-Папэна? Гітлер адхіліў гэту прапанову і патрабаваў перадачы кіраўніцтва ўрадам і ўсёй дзяржаўнай уладай у поўным аб'ёме нацыянал-сацыялістыкай партыі. Гіндэнбург рашуча ад хіліў гэта патрабаваньне, матывуючы яго тым, што ён «цясе адказнасьць перад сваім сумленьнем і перад бацькаўшчынай і лічыць немагчымым перадачу ўсёй дзяржаўнай улады выключна нацыянал-сацыялістам, якія маюць намер скарыстаць гэту ўладу аднабакова». Гіндэнбург выказаў жаль, што Гітлер ня лічыць магчымым у адказнасьці са зробленымі напярэдадні выбараў у рэйхстаг заявамі падтрымліваць «нацыянальны ўрад», які карыстаецца давер'ем рэйхсканцлера.

У заключэньне Гіндэнбург зьвярнуўся да Гітлера з сур'ёзнымі ўгаворамі, заклікаючы яго праводзіць «па-рыцарску» дэкларавану нацыянал-сацыялістамі апазыцыйную палітыку ў адносінах да новага ўраду.

Нацыянал-сацыялісты ў сваю чаргу апублікавалі паведамленьне з нагоды ўчарайшняй гутаркі Гіндэнбурга з Гітлерам, у якім падкрэсьліваецца, што з прычыны таго, што Гіндэнбург адмовіўся ўскласьці на нацыянал-сацыялістыкую партыю, як мацнейшую партыю, кіраўніцтва ўраду,—перагаворы прарваны. Неабходныя мерапрыемствы для далейшай барацьбы з нацыянал-сацыялістыкім рухам будуць абвешчаны на канфэрэнцыі кіраўніцтва, якая адбудзецца на наступным тыдні.

Далей у паведамленьні ўказваецца, што нацыянал-сацыялісты яшчэ выкажуцца адносна афіцыяльнага камунікэ і сустрэчы Гітлера з Гіндэнбургам і фон-Папэнам, якое па іх думцы ў некаторых пунктах мае сур'ёзныя недакладнасьці.

Пад ударамі рабочых, контр-рэвалюцыйны мяцеж быў ліквідаваны

ПАРЫЖ, 13. З Гішпаніі паведамляюць аб падробязнасьцях падзей у Сэвільлі. Калі генэрал Санхурхо вывеў войскі на вуліцу з мэтай захапіць уладу ў Сэвільлі, рабочыя адразу кінулі работу на фабрыках і выйшлі на вуліцу. Прафсаюзы, якія знаходзяцца пад кіраўніцтвам кампартыі, зараз-жа заклікалі рабочых да ўсеагульнай забастоўкі. Па закліку камуністаў пасьледвалі ўсе рабочыя, у тым ліку і анарха-сындыкалісты і сацыялісты. Жандармэрыі і войскам не ўдалося разагнаць дэманструючых рабочых, бо **салдаты адмовіліся адкрыць агонь.** Генэрал Санхурхо быў вымушан адклікаць войскі ў казармы. Контр-рэвалюцыйны мяцеж быў фактычна ліквідаваны.

14 жніўня раніцою, калі рабочыя даведаліся, што Санхурхо ўцёк і горад фактычна знаходзіцца ў руках рабочых, пачаўся рух супроць контр-рэвалюцыянэраў, падпалы дамоў і клюбаў контр-рэвалюцыянэраў. Увечары на скліканым камуністамі масавым мітынгу рабочыя пастанавілі патрабаваць роспуску грамадзянскай гвардыі, выкліканьня ўсіх палітзьняволеных, узбраеньня рабочых і сялян, стварэньня рабоча-сялянскага трыбуналу і суда над Санхурхо. Рух рабочых у Сэвільлі хутка пашырыўся, ахапіўшы большасьць гарадоў Сэвільскай правінцыі.

Гішпанскія рэакцыянэры ўцякаюць у Партугалію

ПАРЫЖ, 14. Паводле паведамленьня «Журналь», у Сэвільлі рабочыя выяўляюць далей рэакцыянэраў, што прымалі ўдзел у мецяжы генэрала Санхурхо. У Мадрыдзе праведзены шматлікія арышты. Дагэтуль па ўсёй краіне арыштавана **3 тыс. чал.** у ваеннай турме ў Мадрыдзе знаходзіцца **110 генэралаў і былых афіцэраў і 220 унтар-афіцэраў.** Некаторыя ваенныя гарнізоны, якія таксама зьбіраліся выступіць супроць ураду ў часе мецяжу, прызналіся ў няўдачы выступленьня ў Мадрыдзе і адмовіліся ад якіх-бы там ни было дзеяньняў. У Партугалію прыбыла вялікая колькасьць гішпанскіх рэакцыянэраў, якія ўцяклі ад рэпрэсій.

Першая харчовая канфэрэнцыя гарбарні „Бальшавік"

14 жніўня адбылася першая харчовая канфэрэнцыя рабочых гарбарні «Бальшавік» па пытаньні аб стварэньні ўласнай харчовай базы.

У рабоце канфэрэнцыі прымала ўдзел 200 чал.

ЗРК «Бальшавік» у галіне мабілізацыі мясцовых рэсурсаў ужо дабіўся паўных посьпехаў. Арганізавана прыгарадная гаспадарка. 280 га засеяна гарадзкімі культурамі. Ёсьць свая малочная ферма, якая мае з 31 карову, сьвінаадкормачны пункт, трусатнік на 87 трусоў.

Але ўсе гэтыя мерапрыемствы ўсё-ж не забясьпечваюць бесьперабойнага снабжэньня рабочых прадуктамі. Так, прыгарадная гаспадарка сёлета зможа забясьпечыць патрэбы ў гародніне толькі на 40 проц.

Пытаньню аб разьвіцьці сьвінаадкормачных апэрацый не аддаецца належнай увагі.

Дэлегаты канфэрэнцыі жорстка крытыкавалі ЗРК за слабае праведзеньне самазагатовак, за марудныя перабудовы работы.

Дэлегат канфэрэнцыі тав. **Гітліц** падкрэсьліў свячасовасьць і правільнасьць пастановы ЦК партыі аб харчовых канфэрэнцыях, якія лавінны даць значны штурпок у барацьбе за стварэньне кожным заводам сваёй харчовай базы, уцягнуўшы ў гэту справу шырокія масы. ЗРК «Бальшавік» павінен па-сапраўднаму разгарнуць са мазагатоўкі, якія да гэтага часу зьяўляюцца яшчэ адсталым вучасткам каапэрацыйна-гандлёвай работы.

Аб гэтым гаварылі і рад другіх удзельнікаў канфэрэнцыі.

Жвавыя спрэчкі выклікала пытаньне аб рабоце сталоўкі.

— Наша сталоўка,—кажа тав. **Сырчук**,—быццам-бы ня наша. Ніхто ёю ня цікавіцца. Няма гаспадарчага вока, няма рабочага кантролю. Заўсёды ў сталоўцы брудна, абеды каштуюць надзвычай дорага. У нашай сталоўцы вельмі вялікія накладныя расходы. Трэст грамаздкага харчаваньня нічога ня робіць для паляпшэньня работы сталоўкі. Яго «кіраўніцтва» ў асноўным зводзіцца да накладаньня на абед лішніх 30 проц. для ўтрыманьня свайго апарату.

Неабходна як мага хутчэй арганізаваць сапраўдны рабочы кантроль, які штодзенна сачыў-бы і дапамагаў перабудове работы каапэрацыі.

На заводзе «Бальшавік» 1.250 рабочых і служачых. Для бесьперабойнага забясьпячэньня іх патрэбна ня менш 450 тон гародніны, 375 тон бульбы, 81 тона мяса, 277 тон малака. Павялічыць стада сьвіней да 220 галоў, а малочную ферму да 138 кароў.

Зямельная плошча каапгасу павінна быць пашырана да 650 га.

Гэта канкрэтны заказ, які даны рабочымі спажыўцамі свайму каапэратыву. Задача ўсіх заводзкіх арганізацый—дапамагчы хутчэйшаму ажыцьцяўленьню гэтага заказу.

Чырвонасьцяжны «Бальшавік»—перадавое прадпрыемства, якое ідзе ў першых радох па выкананьні прамфінпляну.

«Бальшавік» павінен мець сваю ўласную харчовую базу, узорны цэх харчаваньня.

Трэба адзначыць, што канфэрэнцыю слаба падрыхтавалі. Пытаньне аб ёй ня было папярэдня прапрацавана на шырокіх сходах рабочых, што адбіліся па ўсёй рабоце канфэрэнцыі.

***

Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК КП(б)Б, гаркому, гарпрафсавету, гарсавету, у якім абавязваецца, пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі, мабілізаваць усю заводзкую грамадзкасьць на баявое выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб паляпшэньні рабочага забесьпячэньня.

ПАПРАЎКА

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ў каментарах да зводкі аб торфаздабычы ўкралася памылка. Надрукавана: «На 8 жніўня па сыстэме Белторфаб'яднаньня каляндарны плян выкананьне толькі на 29,1 проц., сэзонны—нае 49,2 проц.» Трэба чытаць: каляндарны—на **52,6** проц., сэзонны—на **45,1** проц.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

У фашысцкай Польшчы

Закрыцьцё дзяржаўных фабрык па вырабу тутуну

ВАРШАВА. Гаспадарчы крызіс у фашысцкай Польшчы, ня гледзячы на антымістычныя заявы кіраўніцтва польскага фашызму аб паляпшэньні кан'юнктуры, бязупынна нагнятаецца і ахапляе ўсё новыя і новыя галіны прамысловасьці. Фашысцкая прэса паведамляе аб закрыцьці **дзяржаўных фабрык па вырабе тутуну ў Касьцяне і Водзіславю** (Верхняя Сілезія) і ў **Быдгошчы.** Прычым фабрыка ў Быдгошчы пару год таму назад была значна пашырана і абсталявана новымі машынамі. На ёй працавала да апошняга часу 500 рабочых, якія зараз выкінуты на вуліцу. Акрамя таго, 30 ліпеня закрылася фабрыка па вырабу тутуну ў **Старагродзьдзе** на Паможы і гэтымі двумі закрываецца ў **Вішніках,** Львоўскага ваяводзтва.

Як зазначае «Газэта Варшаўска», у **Старагродзьдзе** пры закрыцьці фабрыкі дайшло да крывавай сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй. Рабочыя, даведаўшыся аб закрыцьці фабрыкі, абвясьцілі забастоўку пратэсту і захапілі фабрычны будынак. Для аднаўленьня парадку былі выкліканы значныя сілы паліцыі. Рабочыя сустрэлі паліцэйскія атрады градам каменьняў. Завязалася зацятая барацьба. Толькі пасьля выплаты дырэкцыяй належачага заработку і дапамогі наступіў спакой.

Тэкстыльная прамысловасьць згортваецца

ЛОДЗЬ. У ліпені бягучага году, паводле афіцыйных даных, з Лодзі было вывезена ўсяго **430.706 кілёграм тэкстыльных вырабаў** на суму 2.772.693 злотых, а ў ліпені мінулага году вывезена **693.475 клгр.** на суму **6.463.364 злотых.** Зьмяншэньне па кошту амаль у **два разы.**

Экспарт шэрсьцяных тканін з Бельскай акругі ў ліпені склаў **4.264 клгр.** на суму **131.254 злотых.** Параўнальна з ліпенем мінулага году экспарт шэрсьцяных вырабаў з гэтага раёну зьменшыўся на **26.389 клгр.,** а па кошту на **1.039.243 злотых.** Як бачым, тэкстыльная прамысловасьць Польшчы ў двух галоўнейшых раёнах бязупынна згортваецца. Як прызнае нават сама фашысцкая прэса, няма ніякіх надзей у будучым на паляпшэньне кан'юнктуры ў гэтай галіне прамысловасьці.

Крызіс у нафтавай прамысловасьці

Першае, што кідаецца ў вочы — дык гэта вялізарнае зьмяншэньне сьвідраваньня. У 1930 годзе паводле афіцыйных даных ва ўсёй Польшчы было прасьвідравана **116.629 мэтраў,** а ў 1931 г. толькі **74.514 мэтраў.** У першым-жа квартале 1932 г. ледзь **14.485 мэтраў,** у той час, калі ў мінулым годзе за гэты-ж пэрыяд часу — **21.263 мэтры.**

У студзені 1930 г. у Польшчы было **110 вышак,** у студзені 1931 г. ужо толькі **80 вышак,** а ў сакавіку 1932 г. **ледзь 58.** Паколькі старыя скважыны вычэрпваюцца, новыя ня сьвідруюцца, дык і здабыча нафты таксама зьмяншаецца. У цэнтры нафтавай прамысловасьці ў Барыславе, дзе знаходзяцца самыя магутныя скважыны, месячная прадукцыя складае **6—10 вагонаў нафты.**

Зараз у нафтавай прамысловасьці працуе ўсяго толькі **9.632 рабочых.**

Заключана польска-данцыгская згода

ВАРШАВА, 14. Польская тэлеграфнае агэнцтва ад 14 жніўня паведамляе: «Сёньня дасягнута згода з Данцыгам (тэрміном на тры гады), якая ліквідуе польска-данцыгскія спрэчкі па пытаньні аб праве стаянкі ў Данцыгскай гавані польскіх ваенных суднаў. Апрача таго, заключана згода, якая прадугледжвае ўзаемныя мерапрыемствы, накіраваныя на аднаўленьне нармальных эканамічных адносін паміж Польшчай і Данцыгам. Згода заключана ў форме пратаколу, падпісанага прадстаўнікамі польскага ўраду і данцыгскага сэнату».

ДЭТРОЙТ—ГОРАД ГОЛАДУ І ГАЛЕЧЫ

НЮ-ЁРК. У рэзультаце абвастрэньня крызісу і бязупыннага росту беспрацоўя, цэнтр амэрыканскай аўтамабільнай прамысловасьці—Дэтройт ператварыўся ў «цэнтр голаду і галечы». Галеча і нужда рабочых як страціўшых работу, так і занятых яшчэ на вытворчасьці дайшлі да апошніх межаў. Зьбядненьне мас выклікае рост рэвалюцыйных настрояў, якія ня раз праяўляліся ў грандыёзных дэманстрацыях. Крывавыя расправы з дэманстрантамі, у прыватнасьці, жорсткі расстрэл дэманстрацыі рабочых, звольненых Генры Фордам, толькі яшчэ больш абвастрылі становішча, параджаючы ўсякі раз новы выбух абурэньня мас. У апошні час амэрыканскі друк усёй часьцей і часьцей з трывогай гаворыць аб становішчы ў Дэтройце, падкрэсьліваючы, што **там насьпяваюць рэвалюцыйныя выступленьні буйнейшага маштабу.** Нядаўна гэтаму пытаньню быў прысьвечан вялікі нарыс вядомага пісьменьніка **Дос-Пасоса** ў штотыднёвіку **«Н'ю Рэспублік».** Цяпер на тую-ж тэму яшчэ больш адкрыта і сьмела піша ў «Нэйшэн» адзін з выдатнейшых амэрыканскіх журналістаў **Халгрэн».**

«Калі я паведваў Дэтройт вясною 1931 году,—піша Халтрэн,—больш 45.000 сем'яў беспрацоўных атрымлівалі дапамогу ад добрачынных таварыстваў. Вясною гэтага году, ня гледзячы на рост беспрацоўя, дапамогу атрымала менш 25.000 сем'яў. Пэрспэктывы на будучыню яшчэ больш сумныя. Дэтройт шпарка набліжаецца да таго моманту, **калі ён ня ў стане будзе аказаць дапамогу хаця-б аднаму беспрацоўнаму, калі ён нават ня зможа аплаціць пэнсію муніцыпальным служачым.** Старшыня добрачыннай камісіі некалькі дзён назад заявіў, што са сьпісу тых, хто карыстаецца дапамогаю, будзе выкрэслена 18.000 сем'яў. Ці можна пры такіх умовах лічыць, што няма падстаў для хваляваньняў у Дэтройце?»

Халтрэн лічыць, што гэтыя хваляваньні прымуць надзвычай сур'ёзны характар.

«Тут тлее агонь сапраўднага паўстаньня,—піша ён.—Гэты агонь пастаянна дае сябе адчуваць рознымі шляхамі. Варта прайсьці па вуліцах рабочых кварталаў, каб пачуць рэзкія словы нездавальненьня і адважныя заявы аб спачуваньні крайнім левым. Сымпатыі рабочых... яшчэ год таму назад былі на баку закону і парадку, цяпер належаць беспрацоўным і іх лідэрам. Калі дапамога беспрацоўным на працягу некалькіх дзён выдаецца ў скарочаным разьмеры, то настрої сярод галодных і расчараваных людзей распальваюцца да ліхаманкавай тэмпэратуры. Было ўжо шмат паасобных мяцежных выступленьняў і былі факты, якія прадвяшчалі значна больш сур'ёзнае хваляваньне. Ночу разьбіваюцца вітрыны магазынаў, а выстаўленыя тавары захватваюцца. Усё больш часта групы з 2-3 чалавек заходзяць у крамы, патрабуюць харчовых прадуктаў у тэй колькасьці, якую яны толькі могуць панесьці і спакойна адходзяць, нічога не заплаціўшы».

На жахлівую галечу рабочага насельніцтва Дэтройту мясцовыя ўлады і прамыслоўцы адказваюць паліцэйскімі мерамі.

«Банкіры і прамыслоўцы Дэтройту,—піша Халтрэн,—дзякуюць лёс за тое, што паліцыя мэра Мэрфі пакуль яшчэ трымае горад пад бізуном. Начальнік паліцыі Ўоткінс паказаў, што ён разумее справу. Ён навадпіў горад, асабліва прамысловыя раёны, сышчыкамі. **Рабочая дэманстрацыя на Мэк-Авэню была задушана з такой жорсткасьцю, якая перавысіла ўсе мінулыя прыклады.** Генры Форд і іншыя аўтамабільныя прамыслоўцы ствараюць прыватную паліцыю, рэкрутуючы для яе людзей з падонкаў грамадзтва. Калі муніцыпалітэт па меркаваньнях эканоміі звальняе частку паліцэйскіх, лешныя з іх зараз-жа наймаюцца аўтамабільнымі кампаніямі. Ніколі ня шкодзіць мець вымуштраваных людзей, якія могуць ва ўпор расстрэльваць рады беспрацоўных. Яшчэ больш старанна праходзяць падрыхтаваньні да «антырадыкальнага паходу», які мяркуецца ажыцьцяніць увосень, калі становішча не палепшыцца. Новы лёзунг чыкагокай газэты **«Трыбуна»,** які гаворыць—«беце чырвоных», карыстаецца ў некаторых колах Дэтройту вялікай папулярнасьцю. Агенты міністэрства працы ўжо пачалі кампанію супроць «непажаданых чужаземцаў». У адзін дзень было пакінута 100 арыштаў, а да высылкі з ПАЗШ прызначаны былі 400 чалавек. Паліцыя таксама павялічвае сваю актыўнасьць. Яна хватае «падазроных радыкалаў» на вуліцах, зьбівае іх у вучастках, а потым адпускае, не прадъявіўшы ніякіх абвінавачаньняў. На падставе заключэньня, данага пракурорам штату, **камуністы з гэтага часу ня будуць карыстацца свабодай слова; пракурор заявіў, што выступленьне ў абарону камунізму зьяўляецца злоўжываньнем свабодай слова і таму ня можа карыстацца абаронай канстытуцыі».**

Але ўсе гэтыя меры ня прыводзяць да задушэньня рэвалюцыйнага руху ў Дэтройце. Пазбаўленая «абароны канстытуцыі», г. зн. абсешчаная **па-за законам** кампартыя карыстаецца вялікім уплывам у рабочых масах Дэтройту.

«Яе прапаганда,—гаворыць Халтрэн,—глыбока ўрэзалася ў тутэйшае рабочае насельніцтва. Асаблівае ўражэньне на рабочых мае тая энэргія і шпаркасьць, з якой камуністы арганізуюць і ўзначальваюць дэманстрацыі супроць зьнижэньня зарплаты, скарачэньня дапамогі беспрацоўным і дыктатуры банкіраў. І банкіры ня ўпэўнены, што рабочыя і ніжэйшыя пласты сярэдняе клясы захаваюць спакой. Яны баяцца, што тое сьляпое падтрыманьне, якое ў мінулым рабочыя аказвалі закону і парадку, цяпер падарвана».

(«Известия»).

Перад другім палётам у стратасфэру

ПАРЫЖ, 14. Адлёт аэрастата **Пікара** ў стратасфэру мяркуецца з Дзюсендорфу, недалёка Цюрыху (Швайцарыя). «Матэн» паведамляе, каб унікнуць нішчаснага выпадку, прымаюцца розныя меры перасьцярогі. У гандолі ёсьць спэцыяльная радыёўстаноўка, якая ў выпадку ўзьнікненьня небяспекі будзе перадаваць у эфір розныя паведамленьні аб месцы знаходжаньня катастрофы і магчымым месцы яго спуску. Спэцыяльны самалёт будзе ў паветры сачыць за ўздымам аэрастату, а ўнізе ў пастаянным кантакце з самалётам будуць курсаваць два аўтамабілі для аказаньня дапамогі ў выпадку неабходнасьці. Паміма таго, у Сяроземным моры будзе дзяжурыць спэцыяльны аэраплян, які павінен будзе прысьці на дапамогу аэранаўтам у выпадку, калі аэрастат упадзе ў мора.

Прафэсар Пікар заявіў карэспандэнту «Рэпублік», што ў яго ёсьць два асноўныя інструманты, якія дазваляюць вырашыць яму пастаўленую задачу па вывучэньні касмічных праменьняў. У гутарцы з карэспандэнтам прафэсар Пікар заявіў, што магчыма спуск аэрастату адбудзецца дзе-небудзь у горах, бо ў гэты час звычайна будуць паўночныя і паўночна-заходнія ветры. Сам узьлёт—у стратасфэру, заявіў ён, патрабуе некалькіх гадзін і некалькі гадзін аэрастат будзе знаходзіцца ў стратасфэры.

Паведамленьні

Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня адкрытага партыйнага сходу 17 жніўня па пытаньні папулярызацыі пастаноў партыі і ўраду аб рэвалюцыйнай законнасьці і пастановы ЦВК і СНК СССР і БССР аб умацаваньні грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці: Ляўкоў (НКЮ) — зав. «Бальшавік», Шнітко (гар. пракурор) — зав. імя Варашылава, Мар'ясіна (НКЮ) — ф-ка «Кастрычнік», Кудраеў (ГСПС) — зав. «Ударжік», Хадасевіч (ГКК) — зав. «Камунар», Топаш (пракуратура рэспублікі) — шклозавод, Рагуновіч (нарсуд 1 вуч.) — абутковая ф-ка, Балабанава (НКЮ) — ф-ка «Камунарка», Рыўкін (НКЮ) — зав. «Полымя рэвалюцыі», Халімонаў (ЦВК) — ф-ка 8 сакавіка, Левін (ЦКК) — ф-ка імя Крупскай, Германаў (нарсуд 3-га вуч.) — Мейбуд, Зэгер (пракуратура рэспублікі) — пяга, Гершон (ЦКК) — эксплёатацыя, Піпкіс (пракур. рэспублікі) — Саюзтранс. Сакратаром партыйных калектываў вышэйпаказаных прадпрыемстваў дагаварыцца з дакладчыкамі аб часе і месцы выступленьняў.

— Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б паведамляе таварышоў, якія езьдзілі ў калгасы па пытаньнях барацьбы са стратамі, зьдзельнічыны і г. д., што працяг нарады адбудзецца 16-га жніўня, у 5 з пал. гадз. веч.

Летні тэатральны „ПРАФІНТЭРН"
Сёньня і штодзённа
5-ы цыкль 5-ы цыкль
„МЮЗІК-ХОЛ"
Пачатак у 9 гадз. вечара.

Чырвоная Зорка
Пач. 7, 8-45 і 10-30. Каса—ад 4 г.
Новы савецкі мастацкі фільм
2 ЖАНЧЫНЫ драма ў 7 ч.
Звыш прагр. хроніка Саюзкіно

„Інтэрнацыянал"
Вясёлая амэрыканская камэдыя
ХРЫЗАНТЭМА
Звыш прагр. хроніка Саюзкіно.

Кіно „Пралетары"
Замежны фільм
НЯВЕСТА БОКСЭРА
Звыш прагр. хроніка Саюзкіно.
Дзённыя дзіцячыя сэансы
ЧАЛАВЕК БЯЗ ФУТЛЯРУ
Звыш прагр. хроніка Саюзкіно.

Кіно „СПАРТАК" з 16 жніўня
2-я СЭРЫЯ 2-я
МІС МЭНД
у 7 частках
Штодзённа 4 сэансы.
Пачатак 1—7 гадз.
II—8 ч. 15 м.
III—9 г. 30 м.
IV—11 гадз.
Каса а 5 г.

САЧЭЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ!
ГАЙЛЬ МОСКАЎ
НЯХАЙ ЖЫВЕ МАСКВА!

Менская гарадзкая страхавая каса
даводзіць да ведама ўсіх страхавацеляў гор. Менску і раёну, што згодна пастановы НКПрацы СССР ад 26-IV—32 г. за № 70, **бальнічныя аркушы** будуць ёю аплачвацца і прымацца для залічэньня ў лік страхавых узносаў **толькі на працягу аднаго месяца** па сканчэньні прадстаўленага на іх водпуску.
Бальнічныя аркушы, па якіх прайшоў месяц пасьля сканчэньня водпуску—
ня будуць ёю прымацца,
а выплачныя па іх сумы аднесены за лік прадпрыемства або ўстановы.
Адначасова Менгарстрахкаса прапануе ўсім прадпрыемствам і ўстановам
да 20 жніўня прадставіць ёй усе бальнічныя аркушы.
МЕНГАРСТРАХКАСА.

Беларускі каапэрацыйны вучэбны камбінат
БЕЛКААПСАЮЗУ
АБВЯШЧАЕ **АСЕНЬНІ НАБОР** СЛУХАЧОЎ
на аддзяленьні: 1) **сельска-гаспадарчае** (памесьніві дырэктараў прыгарадных гаспадарак); 2) **каапэрацыйнае** (інструктары арганізацыі спажыўкаапэрацыі); 3) **гандлёвае** (арганізатары савецкага гандлю сярэдняга зьвяна спажыўсістэмы).
Прымаюцца асобы з адукацыяй 7-годкі на першыя два аддзяленьні і з адукацыяй 4-5 груп сямігодкі на трэцяе аддзяленьне. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Да заявы прыкладаюцца дакументы аб сац. становішчы, адукацыі, узросьце, стане здароўя і анкета.
Заявы накіроўваць да 1 верасьня па адрасе: гор. Бабруйск, Сацыялістычная, 128, Бабруйскаму каапэрацыйнаму вучэбнаму камбінату.
Дырэкцыя камбінату.

Усім прадпрыемствам БССР,
якія атры малі ад „ГЛАВЭНЕРГО"
для запаўненьня **бланкі тэрміновых данясеньняў на форме Э-Ь,**
прапануецца ў 3-дзённы тэрмін з моманту апублікаваньня гэтай абвесткі выслаць гэткія за I і II квартал **у кіраўніцтва Белэнэрга** (Асіп буд. Белэнэрга) і іншыя паказаныя ў інструкцыі адрасы і ў далейшым строга прытрымлівацца паказаных тэрмінаў, у працяўным выпадку да неакуратных будуць ужыты адміністрацыйныя меры спагнаньня рж да перадачы справы пракурору.
Начальнік сэктару вучоту і справаздачнасьці Белэнэрга **ХАЗАНАЎ.**
Адказны выканаўца **ДУБАВІЦКІ.**

ЦСПСБ, Наркамцяж, Наркамлес, Наркамзнабі Белкаапсаюз скліканць 17 жніўня, у 10 гадз. раніцы, у залі пасяджэньняў ЦСПСБ
УСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ
пам. дырэктараў па раб. забесьпячэньні, старшынь ФЗМК і старшынь ЗРК
ПА ПЫТАНЬНЯХ:
1. Аб становішчы і пэрспэктывах рабочага забесьпячэньня.
2. Разгляд палажэньня аб пам. дырэктараў па раб. забесьпячэньні.
На нараду зьмуляюцца: пам. дырэктараў па раб. забесьпячэньні, старшыні ФЗМК і старшыні ЗРК па персональных выдзіках Наркамцяжу, Наркамсаўгасу, Наркамлесу, ЦСПСБ, ЦП саюзу і Белкаапсаюзу.
Арг. камісія па скліканьні нарады.

КАНФЭРЭНЦЫЯ
настаўнікаў школ гор. Менску і Менскага раёну
адкрываецца **25-VIII. у 5 гадзін вечара, у пастыш. Дому Асьветы.**
Камуністычная, 19.
Яўка ўсіх настаўнікаў абавязковая.
Заг. Гарана Зеньковіч.

Беларускі
ТЭХНІКУМ ФІЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
ў Менску
абвешчае **АСЕНЬНІ НАБОР** студэнтаў
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Жадаючыя вучыцца павінны мець адукацыю ня ніжэй VI гр. сямігодкі, прысылаць дакументы аб сац. становішчы, аб здароўі, аб нараджэньні, аб адносінах да вайсковай службы і запоўніць заверaную анкету.
Прыём заяў праводзіцца да 1 верасьня г.г., якія трэба накіроўваць: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса, Вышэйшы Савет фізычнай культуры.
ДЫРЭКЦЫЯ.

БРАГІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІКУМ
іўпнай сацыялістычнай малочнай жывёлагадоўлі
абвяшчае асеньні набор студэнтаў
Прымаюцца асобы на 1 курс з адукацыяй за сямігодку, на II курс—за 8-9 груп.
Да заявы неабходна прыкласьці ўсе дакументы ў арыгінале, згодна існуючага палажэньня аб прыёме ў тэхнікум і ВНУ.
Прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца з 1 кастрычніка 1932 году.
Дакументы накіроўваць па адрасе: БССР, м. Брагін, тэхнікум
Дырэктар тэхнікуму
ВАЛАДЗЬКО.

ПОЛАЦКІ ЛЕСАТЭХНІЧНЫ ТЭХНІКУМ
у зьмену апублікаванай раней абвесткі, абвяшчае прыём заяў па асеньні набор на 1-шы курс тэхнікуму і 1-шы курс лесправгасвучу, які ёсьць пры тэхнікуме. Колькасьць прыёму ў тэхнікум па аддзяленьнях наступная: а) на лесазагатоўчае адд.—60 ч., б) лесаўпарадкоўчае—30 ч., в) рахункова-статыстычнае—30 ч. Прыём у леспрамгасвуч на лесазатоўчае і лесакультурнае аддзяленьні—90 ч. Тэрмін навучаньня—2 гады. Узрост паступаючых у тэхнікум ад 16 да 25 г., у леспрамгасвуч—ад 15 да 19 г. Тэрмін падачы заяў да 1-га верасьня. Без іспытаў прымаюцца ў тэхнікум асобы, скончыўшыя 7-годку, ФЗО, ШКМ і вышэй; у леспрамгасвуч—з адукацыяй ня ніжэй 5 груп сямігодкі. Для іншых, якія ня маюць належнай адукацыі, прызначаюцца іспыты на 10-15 верасьня. Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка. Усе прынятыя ў тэхнікум і ў леспрамгасвуч забясьпечваюцца інтэрнатам. Стыпэндыямі ў разьмеры ад 25 да 120 р. студэнты тэхнікуму забясьпечваюцца на 65 проц. Вучні леспрамгасвучу забясьпечваюцца стыпэндыямі на 100 проц. Да заявы далучаюцца наступныя дакументы (арыгіналы): аб узросьце, аб асьвеце, аб сац. і матар'яльн. становішчы, апрача таго для калгаснікаў—даведка аб часе ўступленьня ў калгас, для сялян аднаасобнікаў—акладны ліст і для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку, засьведчаная анкета, даведка аб стане здароўя, аб адносінах да вайсковай павінасьці, дзьве фотакарткі і паштовых марак на 35 кап.
Дырэкцыя Полацкага Лесатэхнікуму.

РЭЧЫЦКАЯ
судабудаўнічая школа (ФЗВ)
абвяшчае **НАБОР СТУДЭНТАЎ** на **1-шы курс.**
Прыём праводзіцца паводле правіл 1932 г.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.
Прыём заяў да 1-га верасьня.
Прымаюцца вучні, скончыўшыя 5-6-7 груп.
Адміністрацыя.

Магілеўскі пэдагагічны інстытут
(г. Магілеў, Ленінская, 35)
працягвае **АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на завочны сэктар** на аддзяленьні:
сацгістарычнае, літаратурна-лінгвістычнае і прыродазнаўчае.
Паступаючыя падаюць заяву і засьведчаную анкету.
Прыём заяў праводзіцца да 15 верасьня.
Завочны сэктар.

БЕЛ. ДЗЯРЖ.
МЭДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ
даводзіць да ведама ўсіх паступаючых у **АСЕНЬНІ НАБОР 1932 г.** на **1-шы курс** ін-ту, што прыём дакумантаў праводзіцца да 1 верасьня 1932 г.
Іспыты з 1-IX—10-IX—1932 г.
Іспытам падлягаюць усе паступаючыя, за выключэньнем скончыўшых мэдрабфак, курсы па падрыхтоўцы ў мэд. ін-т і скончыўшыя мэдтэхнікумы, якія маюць 3-гадовы практычны стаж.
Адрас: Менск, Універсытэцкі Гарадок, Мэдінстытут.
Дырэкцыя.

УВАРАВІЦКІ
АЎТАТРАКТАРНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае, што **прыём заяў** на **АСЕНЬНІ НАБОР** студэнтаў на **1-шы курс** у ліку 90 асоб **працягнут да 5 верасьня.**
Прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме 7-годкі. Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-мэханікаў па рамонце. Усе студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, а стыпэндыяй на агульных падставах.
Да заяў неабходны дакументы: аб сац. становішчы, аб асьвеце, аб нараджэньні, аб стане здароўя, засьведчаная анкета, дзьве фотакарткі, паштовыя маркі на 30 кап.
Заняткі пачнуцца з 1 верасьня.
Заявы падаваць па адрасе: ст. Уза, п/а Уваравічы, Аўта-трактарны тэхнікум.
Дырэкцыя тэхнікуму.

ДОБРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ШКОЛА ФЗВ ПАПЕРНІКАЎ
(БССР, Гом. раён)
абвяшчае **АСЕНЬНІ НАБОР вучняў,** скончыўшых 7-годку, на наступныя аддзяленьні:
1. Электра-мэханічнае (падрыхтоўка электра-мэханікаў, такароў, сьлесароў).
2. Цэлюлёзнае (падрыхтоўка высокакваліфікаваных рабочых для новага саломена-цэлюлёзнага заводу).
3. Папернае (падрыхтоўка высокакваліфікаваных рабочых для папяровай фабрыкі).
Тэрмін навучаньня 2 гады. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай пры школе.
Да заявы трэба прыкласьці дакументы: аб адукацыі, узросьце, здароўі, сацыяльным і матар'яльным становішчы, і указаць свой хатні адрас.
Падаўшыя заявы павінны чакаць пісьмовага паведамленьня аб часе прыезду ў школу для праходжаньня мэдфізгадбору.
Прыём заяў да 25 жніўня г. г.
УВАГА: На паперныя аддзяленьне прымаюцца асобы, якія маюць адукацыю за 5—6 груп сямігодкі.
Загадчык школы ФЁДАРАЎ.

ГОРАЦКІ
аэра-фотагеадэзычны камбінат
ПРЫ НАРКАМЦЯЖПРАМЕ СССР
абвяшчае **АСЕНЬНІ ПРЫЁМ** студэнтаў на 1-шы курс на наступныя аддзяленьні:
Інстытут з аддзяленьнямі
1. Аэра-фотагеадэзычнае аддзяленьне 50 чал
2. Астранома-геадэзычнае „ 50 „
3. Картаграфа-геадэзычнае „ 50 „
Тэрмін навучаньня ў інстытуце 4 гады.
Інстытут рыхтуе інжынэраў—фота-геадэзыстаў, інжынэраў